**Андрэй Хадановіч**

# НЕСЫМЭТРЫЧНЫЯ СНЫ

*укніга+аўдыё*

Мінск
І.П. Логвінаў
2010

**Хадановіч, А.**

Несымэтрычныя сны / Андрэй Хадановіч. — Мінск : І. П. Логвінаў, 2010. — 120 с.

У новай кнізе Андрэя Хадановіча сабраныя вершы, напісаныя збольшага ў 2008–2009 гадах. Некаторыя тэксты былі напісаныя раней, але не ўваходзілі ў папярэднія кнігі аўтара.

**ISBN 978-985-6901-63-1.**

## АБМЕНЬНІК

*Я прыходжу ў «абмен валюты»:*
*памяняць на верасень люты,*

*памяняць на грошы гады,*
*каб — нябедны і малады,*

*каб яшчэ раз пабыць дзіцёнкам,*
*абмяняцца з табой пярсьцёнкам,*

*каб жадалі каханьня ў тосьце,*
*каб — жывыя ўсе нашы госьці…*

*Па якім мяняеце курсе?*
*Толькі дзеўчына зноў ня ў курсе.*

# I.
# СЬВЯТА ПАЭЗІІ

## НАЧНАЯ ЧЫТАНКА

люблю калі збываюцца прыдумкі
і карабель «хаос» ляціць у космас
паэт зафіксаваў свае лятункі
і песьцячы наяве нечы комплекс
дзяўчынка не вымае з рота гумкі
гартаючы амэрыканскі комікс

пачатак траўня першая маланка
забытая вядзьмаркаю спадніца
на гарцы шабаш на алімпе п’янка
і ветраная гэба-чараўніца
читатель ждёт уж рифмы «лесбиянка»
паэту сьніцца рыфма
«навальніца»

паэт на водах мроіць аб свабодах
з каханкай і яе вучоным мужам
вучоны муж ліе гарбату ў сподак
на злосьць музычным крытыкам і сьцюжам
ласкавы май пяе аб вешніх водах
ружовым вечар*а*м і белым ружам

аўфідэрзэйн свабодная стыхія
хацелі ў прагу пасадзілі ў танкі
адных няма ўдалечыні другія
скуголяць пад каштанамі каштанкі
чытач чакае рыфмы «настальгія»

а слухачы сваёй начной чытанкі

хацелі помнік атрымалі гэткі
што вырасьце калосам кожны колас
нібы агент ангельскае выведкі
жывы журнал захоўвае твой голас
і тчэ рука забыўшыся і кветкі
харошыя і сьвежыя як колісь

## ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦІ (78):

літаратура, вершы, багдановіч, купала, колас,
сінія касачы, шыпшына, чытаць уголас,

дантэ, шэксьпір, іліяда, моцарт, сакрат, аффтар выпей йаду,
андэрсэн, казка бочкі, бачонак амантыльяда,

пушкін, ліцэй, каханьне, анакрэонтыка, лесбас,
п’яны карабель, заблуканы трамвай, трыццаць восьмы
тралейбус,

кніжны развал, блышыны рынак, сьвет як супэрмаркет,
зьбіраць пазлы, зьбіраць грыбы, зьбіраць паштовыя маркі,

пераводзіць гадзіньнікі, перакладаць бадлера, пир
во время чумы, каханьне падчас халеры,

культурна адпачываць, пахмельле, запой, печая,
ядвігін ш., пінігін м., анегін я.,

віктар шалкевіч, шалікі, дранько-майсюк, дранікі,
пад’ёмныя краны, стоп-краны, газавыя кранікі,

вершы быкава, дуліны, знак бядулі, слухай бацьку,
палёт над гняздом зязюлі,

людзі на балоце, сэрца на далоні, сена на асфальце,

сарока на шыбеніцы, лілі марлен у перакладзе с.жадана,

сэтан-томпсан, біянкі, белы бім-шэрая шыйка,
паэзія як здабыча радыю, радыё марыйка,

жан марэ, гойка мітыч, кірк дуглас, ален дэлён,
веславаньне, футбол, біятлён, біятлён, біятлён,

сьвяткаваньне калядаў да самага новага году,
творчасьць, любімая праца, мама, сябры, свабода,
хадановіч алена, марына шода.

## ПЯЦЬ (І БОЛЕЙ) РЭЧАЎ, ЯКІХ Я НЯ ЎМЕЮ

Апавядай, дзе канкрэтна злажаў у жыцьці.
Мы спавядаліся, й ты нам скажы пару рэчаў.
Будзе нагода й праверыць, ці ўмееш лічыць да пяці.
Трэ было ўдаць, што ня ўмею. Але не пярэчыў.

Што ж, правяду, загінаючы пальцы на ўмелых руках,
покуль да ног не дайшоў, па сумленьні экскурсію пешую:
плесьці ня ўмею ні гаплікам, ні на прутках,
шыць, вышываць, цыраваць, гатаваць. Гэта першае.

Есьці ня ўмею патроху і трохі лайдачыць,
тэлефануюць — па колькі гадзін балбачу.
У інтэрнэт на хвілінку зайшоў, гэта значыць —
выйду адтуль не раней, чым туман уваччу.

Ігнараваць апытанкі, дурныя флэш-мобы,
справай карыснай заняцца й ня гнаць тут пургу
мог бы. Павінен магчы і, у прынцыпе, мог бы...
А не магу.

Я па-ангельску лічу, як той герцаг падвескі,
зь лічбы «трынаццаць» суцэльныя цемра і гул.
Я не магу на хаду напісаць смскі,
бо смсак ня ўмею пісаць наагул.

Я анічога ня цямлю ў паветраных зьмеях, не абазнаны,
як Дракула, ў групах крыві...

Кінь, гэта проста, бо гэтага шмат хто ня ўмее, гэтага й дурань ня ўмее. А ты нас зьдзіві!

Сон маладых вартавацьь, як узброены сьвечкаю прывід,
класьці пад ёлачку дзеткам што ў тундры накалядаваў,
з чыстай вады гнаць віно і па моры прайсьці ў судаходны пэрыяд
можаш?
Ня ведаю. Не спрабаваў.

## МАЙСТАР-КЛАС

Нeяк сустрэў малады літаратар сябра. Сябра журы.
— Можна з Вамі пагаварыць?
— Валяй, гавары.
— Не, я хачу, каб *Вы* мне штось расказалі!
— Што, проста зараз? Вось тут, на вакзале?
— Добра, давайце зойдзем пагрэцца ў той вунь вагон.
Вы мне раскажаце пра якісь невядомы іншым закон.
Як дагадзіць пераборлівым музам?
Як жыў паэт за Саюзам? Як выжыць за Эўрасаюзам?
Я прачытаю свой твор, што на конкурс паслаў ананімна.
— Конкурс каляднага верша?
— Не, блін, дзяржаўнага гімну!
Хто там, скажыце, з Вамі яшчэ ў журы?
Хто малады і прасунуты? Хто непрасунуты? Хто стары?
Як спадабацца мне ўсім і перамагчы ў гэтым конкурсе?
Што яны п’юць? Шампанскае ці самагонку ўсе?
Разам праверым гармонію альгебрай і геамэтрыяй.
Сам бо я ў гэтым нічога ня петру.
Але давяраю мэтру я.
Потым у тамбур разам сходзім да ветру.
Так, за душэўнай размовай, глядзіш — і даедзем да Маладэчна.
Згода?
— Ну, не. З маладым літаратарам зьвязвацца небясьпечна.
Ты ж, як я ведаю, слэмэр, нудыст, вычварэнец.
А я шчэ дружу з галавой.

І разышліся: паэт Хадановіч — у свой бок,
а старшыня ПЭН-Цэнтру — у свой.

## ДЗЯСЯТКА ЗАПАВЕТАЎ ДЛЯ МАЛАДЫХ ПАЭТАЎ

1. ХАЙ НЯ БУДЗЕ Ў ЦЯБЕ БАГОЎ,
акрамя хараства радкоў.
Але нават з тых, што выйдуць прыгожа і шчыра, НЕ РАБІ,
калі ласка, КУМІРА.

2. НЕ ВЫМАЎЛЯЙ ІМЯ ГОСПАДА, БОГА ТВАЙГО, МАРНА:
банальныя рыфмы наогул гучаць бяздарна,
ды асабліва шкода нябог,
што бяздарна рыфмуюць «Бог».

3. ПАМЯТАЙ ДЗЕНЬ СЬВЯТЫ,
толькі суботу сваю вызначаеш ня ты.
ШЭСЬЦЬ ДЗЁН ПРАЦУЙ І РАБІ ЎСЯКІЯ ДЗЕІ ТВАЕ,
покуль муза не дастае.
А ў «суботу» прычэпяцца зь нейкаю працай — пасылай іх і
музу мацай.

4. БАЦЬКУ СВАЙГО І МАЦІ СВАЮ ПАВАЖАЙ —
і будзе ўчынкам тваім умалот і ўраджай,
але графаманіць пра маму — вялікае гора:
ня ў кожнага выйдзе ня горай за дзядзьку Рыгора.

5. НЕ ЗАБІВАЙ сымпатычных герояў:
хопіць і тых, што празаік накроіў.
Лепей часьцей беражы сучбелліт
клявішаю «delete».

6. НЕ ЧЫНІ ПЕРАЛЮБУ
з музамі папярэднікаў — высьцерагайся клюбу
для тых, каму за...
З табой — маладзейшая муза.

7. НЯ КРАДЗЬ —
рукапісы не гараць:
пяць хвілін пацешыўся плягіятам,
а пасьля твой унук адчувае сябе вінаватым.

8. НЕ КАЖЫ ІЛЖЫВАГА СЬВЕДЧАНЬНЯ, —
гавару маладому крытыку: тусавацца —
ня хопіць печані, калі ж хопіць — ідзі ў палітыку.

9. НЯ ПРАГНІ ДОМУ творчасьці БЛІЗКАГА.
(Лепей — рыскага ці парыскага).

10. НЯ ПРАГНІ ЖОНКІ ЧУЖОЙ, ні яе палюбоўніка,
НІ РАБА, НІ РАБЫНІ ЯГОНАЙ ахоўніка,
ні літаратурных мурынак,
што працуюць на іншы рынак.
А на розных ВАЛОЎ і АСЛОЎ
увогуле шкода слоў.

## РАЗМОВА З РЭХАМ

—Хто скажа табе, калі ты не зашпіліш прарэха?
— …рэха.

—І толькі яно, бо людзям усё роўна настолькі?
— …толькі.

—Хто будзе маніць, хто падставіць цябе неўспадзеўкі?
— …дзеўкі.

—Ёй будзе няёмка, як схлусіць табе незнаёмка?
—…ёмка.

—І хто яны ўсе, у якіх ты ня знойдзеш спагады?
— …гады.

—Што кажуць табе, зь іх грашыма, з басэйнам і з пляжам?
— …спляжым.

—І хто ты для іх, што ні бэ ў тваёй мове, ні мэ, бля?
— …мэбля.

—Куды яны шлюць цябе, зь беднай тваёй апранахай?
— …

## СЬВЯТА ПАЭЗІІ

(Па матывах Андрэя Радыёнава)

Вечарына паэзіі, на жаль, пераносіцца —
*аўтар учора палучыў у пераносіцу.*

Аўтар хацеў быць ня горшым за Ясеніна,
і вось вечарына паэзіі адменена.

Аўтар чытаў свае вершы прастытуткам.
На трэцім радку яго назвалі ублюдкам.

Маўчаньне — золата, слова — срэбра.
Аўтар адказаў. Яму далі па рэбрах.

Аўтар хадзіў у выкшталцоных лірыках,
пакуль пагодным вечарам ня трапілі па нырках.

Аматар Бадлера, перакладчык Паўнда
не пратрымаўся да канца першага раўнду.

На чужыя мазгі не шкадуючы пудры,
ён нешта пра каханьне выпісваў на кампутары,

трымаўся за мышку на зайздрасьць мікі-маўсу,
але ў канкрэтнай бойцы трох хвілін не пратрымаўся.

Аўтару заехалі шыкоўнаю буцай.

Вечарыны паэзіі, на жаль, не адбудзецца.

Упаў на зямлю, як пад сярпом тваім калосьсе.
Вечарыны не адбудзецца. Сьвята адбылося.

# II.

# ПАЛЕСКІ ЦЫРУЛЬНІК

## ПАМЯЦІ ДРЭВАЎ

На вуліцы, што галіма завецца Маркса,
дзе нават Карэніным гідка падаць пад колы,
філфак, бы юнак на дапросе, цьвёрда трымаўся у
шэрым будынку Вышэйшай партыйнай школы.

І мы пачуваліся б тут, нібы на вакзале,
і ўсё было б тут паскудна, калі б ня дрэвы,
якія штогоду ў вясновай канцэртнай залі
выконвалі ролю ў бэза на разагрэве.

Вы ўчора яшчэ дажджом сьцякалі па кроплі,
цяклі за каўнер і тушшу паўзьлі па твары —
зялёныя, як ружовыя нашы соплі,
ружовыя, як зялёныя нашы мары.

Як файна ля вас разьліўное піва пілося
пад рыбу з шыкоўным іменем путасу,
а ўчора ад вас нічога не засталося, і
толькі ружовыя соплі ў носе нясу.

Бо вас паскідалі трупамі каля ўзбочча,
і гэтыя згадкі, і гэтыя словы ня лек вам,
ды толькі мясцовы паэт упарта балбоча, складаючы
штосьць зь недарэчнай назваю рэквіем.

Яму па-любому, як правільна — «дрэваў» ці «дрэў»,
бо ўчора ён не сустрэў вас — і захварэў.

## ПЭ. ЭС.

У ноч, калі лебедзю ў сквэры скруцілі шыю,
а дзеўчына зноў засталася без парасона,
я цягаўся па Менску, зьбіраючы словы чужыя,
і каля Батанічнага саду з адной сустрэўся пэрсонай.

Ён працягнуў мне ў пластыкавай бутэльцы «джын-тонік»,
паглядзеў так, нібы запрашаў у рэлігійную сэкту,
і прадставіўся як выдавец белліту й крыху садоўнік, анёл-садоўнік
гэтага вось праспэкту.

І я слухаў яго, фільтруючы словы і кантралюючы рухі,
покуль ён разбаўляў свой «джын-тонік» гарэлкаю проста з рыльца.
І матылькі начныя сядалі яму на рукі,
і ён дыхаў цёплым паветрам на іхныя крылцы.

Мы пайшлі да дзіцячай чыгункі — калі яшчэ гэты ранак!
Другая пляшка «джын-тоніку» для падтрыманьня гаворкі.
— Дарэчы, як цябе зваць? Мяне Франак. Да ну
цябе, малец, у сраку! Сам ты Георгій!

На будынку бібліятэкі агеньчыкі танчылі полечку.
На стаянцы таксі цалаваліся закаханыя парачкі.
Ён сказаў мне, што ён ганаровы жыхар Наваполацку, і выцягнуў з
торбы падпольных кніжак два пачкі.

Драўляны дзядок ганяў мухабойкай кабету-інсэкту
на радасьць дзядам і бабулям у маргінальнай крытыцы…
А я глядзеў, як аднафамілец прахезанага праспэкту
піў і дыхаў начным матылькам на халодныя крылцы.

## МУЖЫЦКАЯ ПРАЎДА

Там, дзе заросла́й пратокай плывуць героі,
кінуўшы сем'і і хатнюю гаспадарку;
там, дзе зьбірацца нельга больш чым па трое,
каб не залішне перагружаць байдарку;

там, дзе ўсё так неймаверна і так яскрава,
што падаецца фільмам зь нянашым удзелам,
толькі руку апэратара водзіць то ўлева, то
ўправа ў вузкім зазоры між плыняю й вашым целам;

там, дзе збываюцца ўсе непатрэбныя мары, дзе
не пужаюць бярвеньні, карчы й камяні, калі
глядзіш на сонца празь цёмныя акуляры і
вяслуеш так хутка, што адстаюць сьляпні;

між Летувой (ці Літвой) і Горадняю (ці Гроднам),
на скрыжаваньні прыемнасьці і карысьці,
ты адчуваеш сябе амаль несьмяротным —
у параўнаньні з істотай, якая хацела ўгрызьці…

Марная марнасьць па найтаньнейшым у краі кошце.
(Праўда, «піла» тут назоўнік, а не дзеяслоў).
Можна пісаць лісты і слаць у бутэлькавай
пошце — скідзельскім пэнсіянэркам будзе багаты ўлоў!

П'еш самаробны напой на зёлках і мёдзе
і адно выпадкова не перабіраеш мяжы,

каб, абудзіўшыся зранку ў цёплым, сухім намёце, верш рамантычны скласьці пра холад і пра дажджы.

*Катранская пушча, ліпень 2004*

## ПАЛЕСКІ ЦЫРУЛЬНІК

*В. А.*

Сонца яму на скуры малюе зоркі і свастыкі,
а ён, паслаўшы апёкі да самай яснай халеры,
паказвае найвышэйшы клас мастацкай гімнастыкі,
калі размотвае стужкай рулён туалетнай паперы.

Плыве за вадою й зрабіўся крыху цырульнікам, бо
неабачлівым рыбкам галовы стрыжэ да шыек,
хвасты падстрыгае русалкам, палескі унікум,
ператвараючы іх у спартсмэнак-паралімпіек.

Воўну з аблокаў стрыжэ і сплаўляе паверхняй ракі,
а рэшткі ўначы сабе цягне ў намёт пад голаў;
смак хлеба, якім ён корміць мясцовых дзяўчат з рукі,
аддае сродкам ад камароў — зрынутых зь неба анёлаў.

Ён ведае, дзе бярозкі растуць скрозь старыя пні,
нібы на голае цела мераюць фенечкі і маністы.
Калі ён заходзіць мыцца ў раку, у мыльнай пене сьляпні
канаюць, быццам замерзлыя ў горных сьнягах альпіністы.

Гарэлку ператварае ўначы ў навальнічны сок,
які цячэ лістотаю дуба ў жывым электрычным праменьні,
і кроплі здаюцца сухімі, як жоўты палескі пясок,
быццам сябры й сяброўкі кінулі зь неба па жмені.

*Сьцьвіга, ліпень 2005*

## ФРАНЦІШАК САПЕГА

*Бяда стомленаму целам, калі неспакой душы адымае ў яго сон; бяда абжоры, калі казытлівы пах страваў не вяртае яму страчанага апэтыту; бяда таму, хто мае розум і грошы, але акрамя гэтага ўсё на яго наводзіць сум…*

*Кажуць, што Эжэн Сю… у сваіх «Парыскіх таямніцах»… намаляваў кн. Францішка.*

***Кн. Лявон Патоцкі***

Францішак Сапега — магнат, прыгажун, пэрсанаж
французскіх раманаў і чутак тутэйшай зямлі.
І можна было б самаўпэўнена выгукнуць: «Наш!»,
каб мёртвыя нашы здагадкі пацьвердзіць маглі.

Паставіў на ўласнай кар'еры вялізарны крыж.
Навошта яна? Пагатоў, у такія часы,
калі нескладана штогоду наведваць Парыж
і лёгка зрабіцца героем бульварнай папсы.

Навошта чытаць, што прыдумаў стары Гэрадот?
Дасьціпны сусед перакажа табе анэкдот.
Усе цябе любяць, бо дзесяць мільёнаў пазык.
Тым больш, віртуозна падвешаны ў роце язык.

Спазнаў і каханьне зь сяброўствам, і картачны стол,
і ўсе таямніцы сталіцы, і сьвет, што наўкол;

спазнаў, як разьюшаны злодзей наводзіць прыцэл, і
раптоўна адчуў: абышлося і ўсё-такі цэлы.

Вэнэцыя — места, што голаў трымае ўгары,
а хвост у вадзе — не раўнуючы пінскі бабёр!..
Ды трэба дадому — праверыць, а як там сябры
і хто зь іх па колькі рухомай маёмасьці сьпёр.

А там крэдытор: «Аддасі мне што браў напавер?»
І што зь небаракам рабіць? Жартаваць: «Аддасю».
І будзе чакаць: крэдытор — ён таксама ня зьвер,
а недзе пільнуе пісьменьнік па прозьвішчы Сю…

Паўсюль тыя самыя гульні ў азартных дамох,
паўсюль тыя самыя зьлівы і неба ў смузе.
Парыж і Дзярэчын — два месцы, дзе жыць бы тым змог,
і тое патроху, і тое калі па чарзе…

Францішак Сапега, герой, авантурнік, магнат,
што ведаў, як робяцца ўчынкі й мінаюць гады,
ішоў па канаце, пакуль не парваўся канат,
усё, што хацеў, атрымаў — і памёр ад нуды.

## БЕЛЫ РЫЦАР

Ён сарамяжлівы зь вечнасьцю і дзяўчатамі:
цяжка разьлічваць на тое, у чым ня кеміш.
Часам на вёслах, ды вечна па-за рэгатамі,
што рэгулярна ладзяць Оксфард і Кембрыдж.

Дні і гады ня будуць геройствам насычаныя:
ані прыгодаў, ані інтрыгаў пры ўладзе.
Нават імя празь дзьве падвойныя зычныя
непазнавальна зьменшыцца ў перакладзе.

А ён пісацьме гісторыі ўсё спакусьней
аб каралях і капусьце ды іншых рэчах,
аб тым, як сядзяць на грыбах нявінныя вусені
і хто сьмяецца апошні ў сям'і кашэчых.

Нешта зрыфмуе пра «помніш мяне?», пра «помню вас»,
сфатаграфуе казачную дзяўчынку
і па-ангельску пакіне апошні омнібус,
не разьвітаўшыся на канцавым прыпынку.

# III.

# ПАРНЫ ТЭНІС

## ЗІМОВЫЯ ГУЛЬНІ

Яна любіла зімовыя алімпійскія гульні — выбух адрэналіну
здараўся, калі глядзела скачкі на лыжах з трампліну.

Падумаць толькі, ты коцісься ўніз па нахіленай плоскасьці —
здаецца, гамон, але не, бо наперадзе ўзьлёт, набліжэньне да боскасьці.

Такога ня бачыў ні бацюшка, ні ксёндз, ні віцебскі
рэбе: аўстрыйскі анёл беларускім буслам завіс у японскім небе.

Покуль не зразумела, што пофіг зімовы спорт,
калі для яе на гітары бярэцца складаны акорд.

Пофіг заняткі ў школе, пофіг Купала і Колас,
калі малады літаратар на ёй выпрабоўвае голас.

І слухала да зьнямогі яго высокае мі,
бы корпіяй раны, заткнуўшы ад сьвету вушы навушнікамі.

Славянскі базар сяброўак на тэмы нафты і газу,
а ейных пытаньняў рыторыка не патрабуе адказу.

Бо катарсіс з комам у горле ня тое, што лёгкі катар,
бо лёс не зімовая алімпіяда, а божанька не камэнтатар.

Так і жыла, ад музыкі скразьнякоў затыкаючы вушы ватай.
А бусел, як біятляніст, намотваў штрафныя кругі над ейнаю хатай.

## БАЛЯДА ПРА АПОШНЮЮ РЫФМУ

Яны стрэліся, нібы менскі і варшаўскі — на брэсцкім вакзале.
Ён крычаў: «Пакажыце мне прыгажуню!» Яму паказалі.

Яны выпілі на дваіх тры бутэлькі й чатыры кухлі,
а калі рэстаран зачынілі, працягнулі ў яе на кухні.

Яна трымала ў руцэ два нажы, нібыта нажніцы — Даліла.
Ён казаў: «Патрабую даліву бладзі мэры!» Яна даліла.

Зранку ён пачуваўся адрэзанай галавой прафэсара Доўля,
зь якою ўдавіца Юдзіф гуляла на шабашы ў боўлінг.

Яны поўзалі ў Брэсцкай крэпасьці па ваду з трафэйнаю каскай.
На чацьверты дзень ён адчуў, што жыцьцё зрабілася казкай.

Ён заходзіў — замест матадора — у вальер Белавескай пушчы,
а яна крычала: «Ў атаку!» і «І як цябе сёньня плюшчыць!»

Яна хлопца прадставіла тату, кандыдату сур’ёзных навук,
як аматара ставіць досьледы, ці праводзіць гарэлка гук.

Ён прадставіў яе сваёй маме, незамежных СМІ журналістцы,
як фанатку, якая ў гарачыя кропкі возіць Божае Слова ў валізцы.

Ён разгадваў зь ёй перад сном адну на дваіх крыжаванку,
але дабрадзейка-фартуна рыхтавала яму падлянку.

Ён паехаў у падарожжа, каб крыху зарабіць на вясельле: накасіць
травы ў Амстэрдаме, нарубіць капусты ў Брусэлі,

але покуль саамахвярна ў Галяндыі нешта пакурваў,
яго дзеўка падступна крочыла па сьлізкай сьцяжыне курваў.

А герой напіваўся і трызьніў багіняй сваёй бязбожнаю,
і памёр ад ранішняй смагі, нам пакінуўшы рыфму апошнюю,

што такіх, як яна, не спакусіце вершам і ня купіце за даляр вы…
Дык чаго яны з намі так жорстка? Бо апошняя рыфма — «лярвы».

## КЛЯСЫКА

Аб дзьверы яе хлапцы разьбівалі лбы,
пасьля залівалі раны з рыльца за ровам.
А сонца хавалася ў шатах яе вярбы,
а вецер ганяўся па лузе за ейным роварам.

Цёткі казалі: «Надта ж любіць сябе».
Дзеўкі казалі: «Хопіць фарсіць, карова!»
Хлапцы маўчалі. Адзін выразаў імя на вярбе,
іншы лісты пакідаў на багажніку ровара.

Дні цяклі, як заўжды: касьба, малацьба,
рыбнагляд, браканьерства, схаваны бровар.
А малец пісаў у рыфму: «Вярба — судзьба»,
а іншы таксама ў рыфму: «Ровар — гейм овэр».

Дзяўчыну зьвязуць у горад — і ўсё, труба!
Мужык яе, кухар (па-гарадзкому «шэф-повар»),
нядаўна купіў круты рэстаран «Вярба»
і мае крутую тачку маркі *Land Rover*.

Палова вёскі нап’ецца — у знак журбы,
другая ўжо будзе пад мухай, а мух тут прорва…
А вецер пляце на прутках ейнай вярбы,
а сонца вяжа на сьпіцах ейнага ровара.

## НІРВАНА

спадарожнік яе пажырае юрлівым позіркам
прыгажуня адказвае дэманстратыўным позехам
чорная шлейка станіка падзяляе напапалам
яе аголенае плячо
і ў думках яго бэдлам

ён думае: во блін даўно не шанцавала ў купэ так
ды марна чакаць узаемнасьці не памяняўшы шкарпэтак
яна думае: меў бы ўсе шанцы дурань закамплексаваны
каб яна тры гады таму ня зьведала смаку нірваны

бо спаць аголенай удваіх цяплей чым адной у піжаме
і яна па-жаночы кахала — крыху аттапыранымі вушамі
і словы з усходнім акцэнтам вядома ж яе спакусілі
пасьля ён вядома ж зьехаў
а словы дагэтуль у сіле

яго салігорскі наступнік быў са сваімі загонамі
спакушаў аўтаспынам і сонцам за тэрыконамі
так часта знаёміў з бардамі што ў дзеўкі разьвіў параною
казаў ёй «мілая» й «сонейка» аднойчы дадаў «лясное»

ён прысьвячаў ёй паэмы як пушкін і маякоўскі
яна выпраўляла памылкі і расстаўляла коскі
ды колькі б музаў над ім уначы ні стаяла з паходняю
ёй падабаліся іншыя творы і пераважна ўсходнія

бо ў ейным ліфце радок СЬВЕТА КУРВА — самы прыстойны
радок
а ліфт — школа бальных танцаў: два крокі ўверх, потым крок
уніз — праз трэці паверх вязе цябе на другі
з надпісамі НІРВАНА і ШАХЦЁР САЛІГОРСК — БАГІ

…злы спадарожнік айчынным вінам запівае грузінскі каньяк
без галаўнога болю прачнуцца ня выйдзе ніяк
а яна пакіне купэ са сьвежаю галавой
у якасьці помсты не абудзіўшы хлопца на канцавой

## СТАРАЯ ПЕСЬНЯ ПРА ГАЛОЎНАЕ

гэтыя шлюбныя гульні, апафэоз бязладзьдзя
як эльфійская песенька ў гоблінскім перакладзе

ён надзімае грудзі, кажа словы чужыя
потым каштоўным каменем вісьне ў яе на шыі

і яна яму хоча — зь верай, надзеяй, каханьнем
віснуць таксама на шыі каштоўным каменем

сёньня ў кіно: альмадовар, фон трыер, джармуш
заўтра відэа дома, пазаўтра пацягне замуж

новыя строі купляе і нават шые
потым глядзіць, а камень на іншай шыі

у найлепшым выпадку за ўсё атрымае кія
што тут паробіш, такія ўсе гарадзкія

іншая рэч, калі пакахае вясковы
ён капітальны, грунтоўны, абавязковы

скажаш яму, што любіш жыць у раскошы
ён парсюка адкорміць, і будуць грошы

скажаш, каб мінімум тры туалеты: ранішні, дзённы
і вечаровы — ён скажа окей, наіўны, як усе маладзёны

працавацьме ўвесь дзень і ўначы ў асьвятленьні поўні
і змайструе табе ў агародзе аж тры шпакоўні

потым вясельле й калі да канца мядовага месяца
ты яго не павесіш і ён з табой не павесіцца

будзеце жыць шчасьліва да сканчэньня вякоў
ходзячы ў агарод і слухаючы шпакоў

## ДЗЕСЯЦЬ СПОСАБАЎ БЫЦЬ ВЫЦЯГНУТЫМ З ЛОЖКА ДЗЯЎЧЫНЫ

*Ты ўжо разьдзеў і цябе ўжо разьдзелі.*
*Хто ж цябе выцягне зь цёплай пасьцелі?*
*Шмат перашкод у інтымным жыцьці.*
*Спынімся на дзесяці.*

Першы спосаб банальны. Сусед прыходзіць пазычыць крэслы
для застольля, а заадно й запрасіць на бяседу.
І нецярплівы чытач, што чакае тут рыфмы «чрэслы», будзе
расчараваны — яна адчыніць суседу.

Другі. Разам з ложкам вы расхісталі й кніжную шафу, і — бля-
кбастэр зь бібліятэкай адразу даходзіць да кульмінацыі,
бо зьверху на вас сыпецца поўны збор з творамі Васіля
Быкава. Першыя восем тамоў. Магло быць і чатырнаццаць!

Трэці. Ты заўважаеш, што вас у пакоі ня двое:
хтосьці варожа шыпіць за стосікам «Нашае Нівы».
«Гэта мой коцік, — тлумачыць яна, — бо я люблю ўсё жывое».
І, выціраючы кроў табе з твару: «Ну так, ён вельмі раўнівы».

Чацьверты. Усё было клас. Яна грызла падушку зубамі.
Толькі ў самы разгар інтымнасьцяў вашых:
«Стой! Там жа па тэліку інаўгурацыя прэзыдэнта Абамы!
Пойдзем глядзець! Што значыць «лепш ідзі да мяне»? Ты што, фашык?!»

Пяты. Звоніць мабільнік. «Танечка, прывітаньне!

Так, толькі вельмі хуценька. Я размаўляць ня ў стане».
І размаўляе гадзіну, радасная, як слон.
З гора вылазіш з ложка і йдзеш глядзець біятлён.

Шосты. Толькі яна прашаптала «ну ўсё, цяпер я цяжарная»,
як вас, уварваўшыся ў дом, паліваюць са шлянгаў пажарныя.
Паўбудынку згарэла, і ты вінаваты, каўбой:
сьвечку запальвалі? Трэба гасіць за сабой!

У параўнаньні зь сёмым, папярэднія — дробязі,
бо яна, пасярод любошчаў, кажа: «З табой так добра!
З раніцы напішу пра гэта ў жывым часопісе...»
Ты ўцякаеш так хутка, быццам у ложку — кобра.

Восьмы. Суворыя людзі ўламіліся ў хату пад раніцу
і забіраюць, але не цябе, а тваю абраньніцу.
Трэ было ў войска самой ісьці, як сяброўкі раілі.
Ледзь не забыўся: падзеі разгортваюцца ў Ізраілі.

Дзявяты. Раптам — сьвятло і хтось шасьцікрылы з трубою.
Ты думаў, што апакаліпсіс і сьвету настаў хэпі-энд.
«Дзяўчына! У нашай галяктыцы ўсе трызьняць толькі табою!
А ты брысь адсюль, распусьнік, ты лішні тут элемэнт!»

Дзясяты — і самы надзейны — спосаб такі:
у дзьверы звоняць яе бацькі.

## ПАРНЫ ТЭНІС (МІКСТ)

Зьбіраючы пары ў каўчэг, капітан быў, відаць, у сасіску —
інакш запрасіў бы на борт беларускага тэнісіста і тэнісістку.

На гэтай зямлі кожны сам за сябе, у сваёй пэрсанальнай аблудзе,
а мірныя беларусы гавораць: «Мы — парныя людзі!»

Сусьвет на краі, ды яна — аптымістка, і ён — аптыміст,
бо прывідна ўсё ў гэтым сьвеце, і ёсьць толькі мікст.

Хай некаму хочацца ўсунуць два пальцы й даўжэй не вымаць іх з разэткі,
ды ўсім, хто гаворыць, што выйсьця няма,
яны кажуць, што ёсьць, і выходзяць да сеткі.

*Ён ня beauty і яна ня beauty,*
*паасобку б'юць і б'юць і б'юць іх,*
*ды калі яны ў пары,*
*яны робяць удары,*
*якіх не відаць на радары!*

Зірнуўшы на іншы бок корта са шкадаваньнем і лёгкай агідаю,
ён падае і выходзіць да сеткі, нібыта нерат закідвае.

Ён падае другую падачу й выходзіць да сеткі наперад, нібыта
другі раз закідвае нерат.

Ён бы і трэці закінуў — і шчэ невядома, што ў нерат бы трапіла,
калі б ворагі не ўвялі супраць трэцяй падачы падступнае правіла.

Яго мячык — як муха, што на ляту набывае вагу слана,
асабліва калі ў кароткай сукенцы зь ім побач на корце яна.

*Ён ня beauty і яна ня beauty,*
*паасобку б'юць і б'юць і б'юць іх,*
*ды калі яны ў пары,*
*яны робяць удары,*
*якіх не відаць на радары!*

Хай зараз мільёны экранаў паказваюць іх паразу,
мільёны пасьвечаных ведаюць: цуд не прыходзіць адразу.

І голуб апусьціцца зь неба, нібы да каўчэга, і захвалююцца сьведкі,
убачыўшы мячык для трэцяй падачы, — і нашы зноў выйдуць да сеткі.

У гэтай гульні не бывае канца, кожны ўдар — гэта новы пачатак,
і, паглядзеўшы на корт, нашы мальцы іначай глядзяць на дзяўчатак.

І, ловячы позірк, дзяўчынка абуджаецца ад зімовае сьпячкі.
Хоць мама гаворыць: «няма чаго тут лавіць»,
яна ловіць і прыносіць хлопчыку мячыкі.

*Ён ня beauty і яна ня beauty,*
*паасобку б'юць і б'юць і б'юць іх,*

*ды калі яны ў пары,*
*яны робяць удары,*
*якіх не відаць на радары!*

## БЕЛАРУСКІЯ МУЖЧЫНЫ

Беларускі мужчына прыходзіць на сьвет
у камарыных укусах замест радзімак
і таму добра ведае: дзе больш балотаў, там больш радзімы.

Беларускі мужчына ўмее апынуцца ў такой багне,
што адтуль ні халеры ня выцягнеш, але беларускі мужчына цягне.

Беларускі мужчына выдатна ведае дзесяць бульбяных страваў
і сто дзесяць адмазак ня чысьціць бульбы, бо мае шмат іншых справаў.

Беларускі мужчына жыве ў самым цэнтры Эўропы,
калі верыць мапе:
ў гэтым цэнтры стаіць канапа і беларускі ужчына
ляжыць на канапе.

*Яго дзед перажыў калгас і мэліярацыю.*
*Яго бацька — крызіс сярэдняга веку і гіпэрінфляцыю.*
*Яго дом перажыў рамонт. Яго кот перажыў кастрацыю.*
*Ён гаворыць, што можа быць горай, — і мае рацыю.*

Беларускі мужчына купляе машыну, прыгнаную з-за мяжы,
і другую палову жыцьця шчасьліва жыве зь ёй у гаражы.

Беларускі мужчына — футбольны фанат. Калі раптам заб’юць мазілы,
шматкватэрны дом патрасаюць пякельныя сілы.

Беларускі мужчына ня чуў пра паліткарэктнасьць ніколі

і таму жартуе так сьмешна, што лепей ня слухаць без алькаголю.

Кожны трэці п’е піва, другі кожны трэці — гарэлку, а трэці трэці разумее: гарэлка бязь піва — грошы на вецер.

*Яго дзед перажыў калгас і мэліярацыю.*
*Яго бацька — крызіс сярэдняга веку і гіпэрінфляцыю.*
*Яго дом перажыў рамонт. Яго кот перажыў кастрацыю. Ён*
*гаворыць, што можа быць горай, — і мае рацыю.*

Беларускі мужчына падасьць жанчыне руку і набудзе кветак,
і аднойчы паабяцае не раскідваць па доме шкарпэтак!

Беларускі мужчына аматар праводзіць выходныя дома.
Часам выйдзе на дзесяць хвілін і вяртаецца ўночы.
Дзе быў, невядома.

Засынае ў таксоўцы, што едзе дамоў,
прачынаецца ў незнаёмым трамваі…
І нікому ня ясна, за што яго жонка трывае,
выбачае футбол і канапу, гараж і буханьне.
Беларускі мужчына — чысты аб’ект каханьня.

*Яго дзед перажыў калгас і мэліярацыю.*
*Яго бацька — крызіс сярэдняга веку і гіпэрінфляцыю.*
*Яго дом перажыў рамонт. Яго кот перажыў кастрацыю.*
*Ён гаворыць, што можа быць горай, — і мае рацыю.*

# IV.
# ДЗЯДЫ

*Драматычная паэма*

## КАРАТЭІСТ

*(замест уступу)*

сем гадзін на паўднёвы ўсход на старэнькім «ЛАЗе»
і вясна за Кармой, і ты ўсё лета ў Чачэрску
дзе сусед-вэтэран, што ведае ўсё аб празе і
смазе з раніцы, лаецца не па-чэску

дзе нас на летні час пераводзяць крыкамі пеўні
у кінатэатры «Акцябар» піраты і магараджы
а вечарамі з плястмасавай крышкі ўсё больш упэўнена
п’ецца мядзьведжая кроў на развалінах ратушы

шыкоўныя «ГАЗ» і «ЗІЛ» на пляцоўцы ля ДОСААФа
сто дваццаць км на сьпідомэтры і мы амаль неўміручыя
і хто мог знаць, што мясцовы маёр, буйнагабарытная шафа
так спрытна бегае й так балюча вушы накручвае

і вечаровыя рамантычныя падарожжы
з мэтай калгасных яблыкаў стырыць у садзе
і першыя траўмы — купаньні старэйшых суседак у
Сожы у таварыстве мальцаў, зь якіх кожны чацьверты сядзе

і Сож быў глыбокі, і віскат быў гучны, і малец быў хуткі
і пад вадою добра чыталіся ўсе іх рухі
і мы, ня ведаючы, як правільна пішацца ПРАСТЫТУТКІ
на прыбярэжным пясочку пісалі ШЛЮХІ

гэта праз год усё выглядала проста

бусі марусі, танькіны станікі, ленкі каленькі
і нязьменны стандарт 90/60/90
хлопцы ўносілі па 90 капеек, а я 60 як самы маленькі

а пасьля міма касы ў краме — лепей ужо маўчы
слоік зь бярозавым сокам — першы сур'ёзны твор мой
і на дзіцячай пляцоўцы недзіцячыя махачы
проста каб разагрэцца ці пахваліцца формай

помню шчарбатага хлопца — пярэднія нехта выбіў
шорты ніжэй за калена і губы ў таматным соўсе
ён замахнуўся двойчы і двойчы схібіў
а на маю нагу потым сам напароўся

думаю, зараз заб'е, а ён хутка залез на плот
і залізвае там баявыя раны
і раптам як закрычыць на ўвесь свой таматны рот
ТЫ ЯШЧЭ ЖЫЗЬНІ НЯ БАЧЫЎ КАРАТЭІСТ ЗАСРАНЫ!

яшчэ памятаю дзьве бойкі ў гонар дзявочай плоці
адна была з дошкамі, іншая з парай лёгкіх гантэляў
але ніпто не закрэсьліць байца на чачэрскім плоце
які два разы замахваўся і два разы не пацэліў

і цяпер, калі нехта па п'яні жадае біцца
я адказваю ветліва: «слухай, наконт біцьця
пры ўсёй калясальнай павазе да тваіх мэга-біцэпсаў
ніхто з нас — ні я, ні ты — яшчэ ня бачыў жыцьця»

## 1. ПРЫВІД

*у чорным-чорным лесе*

*за чорнай-чорнай ракой*
і ўсе чачэрскія дзеці штовечар гублялі спакой

*на чорнай-чорнай паляне*
і зырылі ў рот дзевяцігадовай Ульляне

*стаіць чорны-чорны дом*
*а ў ім чорны-чорны…* замоўкні, дурань, ніякі ня дзядзя Том

*у чорным-чорным пакоі*
заткніся, разумнік, чорт ведае што такое

*на чорным-чорным ложку чорная-чорная падушка*
не рагачы, Андрушка

*у чорнай-чорнай падушцы чорная-чорная голка*
цішэй, Міколка

*з чорнаю-чорнаю ніткай*
хто хоча працягу — частуй шакаляднай пліткай

і мы пагаджаліся з гэтай драпежнай палітыкай
бо ў Валеркі бывалі цукеркі
жуйкі ў буржуйкі Валі
і ўсе давалі

дык вось, прынесьлі дадому бохан чырвонага хлеба
іншага ў краме не засталося, а есьці трэба
елі мама і тата, і сын, і сястра ягоная
(а буханка чырвоная!)
толькі заснулі, як у сьцяне адчыняецца дзьверца…

## АДДАЙ МАЁ СЭРЦА!

міжгародні аўтобус спыняецца на прыпынку
маці выбегла на хвілінку
пакінуўшы ў ім дзяўчынку
праходзіць хвіліна, і дзесяць, а мамы няма і няма
дзяўчынка выходзіць сама
шукае маму — дарма
мінае восень, зіма
а тата-міліцыянт яе ўсё ня знойдзе
і толькі ўлетку будаўнікі, зламаўшы асфальт,
знайшлі валасы і пазногці
на глыбіні два з паловай мэтры
а ўночы з мамінай шафы зьявіўся прывід у мамінымі швэдры

і тут найстарэйшы з нашай кампаніі, Коля
абсалютна бясплатна пагнаў гісторыі, што яму ў школе
апавядаў прасунуты прэпад па маляваньні
пра труп, схаваны ў лядоўні, пра кроў нябожчыка ў ваньне
пра тое, як муж сваю жонку замураваў у сьцяне
мы слухалі, нібы ў сьне
як сэрца забітага стукала пад паркетам
настаўнік быў геніем, вучань — таксама някепскім паэтам
і мы траплялі ў адаптаваныя для райпо
пекла Лаўкрафта і рай По

толькі тут мы заўважылі, што сапраўды ўжо вечар
што згусьцілася цемра і ў доме насупраць
на словах «…Маргарэт Тэтчэр…»
радыё змоўкла раптоўна, а дом наагул

карыстаўся нядобрай вядомасьцю

гаспадары неяк зьніклі з усёй іх маёмасьцю
а бабуля казала, што добрых людзей ніколі ў ім не жыло
часам у вокнах запальвалася, потым гасла сьвятло
часам гучала і раптам змаўкала радыё
вось і цяпер: сядзім мы на ганачку й самі ня радыя
што, калі гэты дом — насамрэч дом з прывідамі?
прывіды людзі сур’ёзныя, помняць абразы з крыўдамі
тэрарызуюць жывых злачынствамі даўнімі
нават такімі, як мы, не пагрэбуюць даўнамі

тут усе спалатнелі
Таня і Сьветка, і нават сястра яе Нэлі
біла дрыготка Жэню
што сарамліва хаваў свае пальцы ў кішэню я ўжо
маўчу пра сваё трымценьне

раптам над намі навісьлі два велізарныя цені
зарагатаўшы на два галасы нелюдзкія:
ШТО, ГАРАДЗКІЯ?!
шчэрачы чорныя зубы й чырвоныя дзясны
Воўка Уздоўскі і Чэчык, граза Калгаснай
з крыкам НЯ ССЫ!
кідалі ў валасы
Сьветцы, якая ляжала са складзенымі на грудзях ручкамі
як і належыць спалоханай прывідам даме
лопухавымі калючкамі
а па-чачэрску — ДЗЯДАМІ

## 2. ОЛІВЭР ТВІСТ

Слухай, навошта агульны сшытак?
Могуць заўважыць, бо тоўсты, а па-другое, які зь яго ўжытак?
Выдраць старонку — дык прыйдзецца дзьве,
і ў кішэню штаноў не пакласьці.
Ты зразумей, не ў памеры шчасьце!
Лепей блакноты красьці.

Тырыць блакнот трэба з сэнсам.
Скажам, вось гэты з букетам і сэрцам
пасуе толькі дзяўчынцы
у занядбанай правінцыі.
Узяўся тырыць — давай нам
з модным сучасным дызайнам. Добра,
хай будзе гэты, з камбайнам.

Спыняць на касе — сябруй з галавой.
Скажаш, што гэта твой,
што носіш заўсёды з сабой, бо рыхтуесься так да дыктовак.
Для даставернасьці можаш стырыць вунь той аловак.

Не расслабляйся, потым яшчэ ў прадуктовы.
Гатовы?

Помні, ня суй пад майку пірожныя заварныя.
Потым ніхто не адмые.
Іншая справа — коржык.
Восем — пад майку, адзін — для алібі ў кошык.

А заварныя цягні адразу ў пакеце.
Дзесяць ня трэба. Саня цяпер на
дыеце.

Шухер! Змывайся! Ды не туды. З
горкі і ў роў, празь дзяды…

Увесь у дзядах — гэта мінус.
Добра, паказвай, што вынес.
Кніжка? «Олівэр Твіст»?
Мне ў прэзэнт? Ты садыст?
Што мне рабіць з гэтым… Дыкенсам?
Мне без патрэбы. Выкінь сам.
Выбраў бы нешта з добраю назвай.
Схавай. Пацанам не паказвай!

## 3. ДРАБІНА ДЗЯДЗІ ЯШЫ

Яна ляжала ў гародзе й бабуля казала: «Наша», ды ўсе
памяталі: драбіну пазычыў нам дзядзя Яша.

Прычым не задарма — адносіў яму трохлітровік соку я. Тады
ён спытаў мяне: «Гэта драбіна — доўгая ці высокая?»

Я сказаў, што высокая. І тады ён паклаў яе на зямлю. У гэты
момант я ведаў, за што яго не люблю.

Драбіна была жалезная. Дзядзя Яша сам яе зварваў. Бацька
круціў каля скроні пальцам, кажучы: «Варвар!»

А потым — іронія лёсу — мы самі яе папрасілі.
Яша цешыўся болей, чым соку, таму, што прагрэс яшчэ ў сіле.

Драбіна нам прыдалася. Быў акурат пачатак
зьбіраньня вішняў. Ля самага плота ў шэраг стаяў дзясятак

красуняў зь цёмна-вішнёвай жывіцаю на камлі, і што магло
быць тады смачнейшае на зямлі?

Вішні былі старыя. Здаецца, апошні год
было столькі ягад. І кожная для нас — забаронены плод.

Першымі ўзьлезьлі на дрэва мае стрыечныя сёстры.
Момант суперніцтва ў нас заўсёды быў вельмі востры,

а тут яшчэ гэтыя вішні. Я лезу, а дзьве сяструхі
косткамі зьверху кідаюцца. Я паскараю рухі.

Абяцаю, што зараз замучае іх аддача!
Я не паводзіўся высакародна, мой шляхетны чытачу!

Паўзу на галіну за імі па прынцыпе трэці лішні…
Пяці сэкунд не мінула, як сёстры адны засталіся на вішні.

Лячу цераз плот на рабіну, а потым, гора-садоўнік, ламаю
рабіну і падаю ў найгусьцейшы дзядоўнік.

На крыкі і трэск прыбеглі дзед з бабай, бацька і мама, і
сёстры спусьціліся зь вішні палюбавацца таксама.

Пад плотам ляжала доўгая (так, дзядзя Яша!) драбіна, зь
іншага боку — я, са мной у абдымку — рабіна.

Продкі схіляюцца нада мной, і пытаюся ў продкаў я:
«Слухайце, а рабіна — нізкая ці кароткая?»

***

З таго часу ў мяне ёсьць рахункі з гародамі і
садамі, драбінамі і рабінамі, вішнямі і дзядамі.

Бо для некага дзяды — гэта сьвята ў лістападзе,
а для іншага дзяды — вэтэраны на парадзе,

для мяне ж — абрад атрасаньня калючак
і мой удзел у абрадзе!

## 4. СЬВЯТОЕ

А зараз не пра дзядоўнік. Зусім не пра тое.

На ўскрайку Чачэрску ёсьць возера з назвай Сьвятое.
Бабуля казала, на гэтым месцы калісьці была царква,
вялізная і надзвычайнага хараства,
якая аднойчы з усімі званамі пайшла на дно.
Кажуць, што часам у цішы тыя званы чутно,
а ў найясьнейшыя дні
макаўку можна разгледзець у глыбіні.

Мы там купаліся й проста культурна бавілі час.
Раз на выходных, за пару крокаў ад нас,
на прыбярэжнай траве сядзелі салдаты.
Двое дзядоў (адзін зьлёгку, другі ўжо ня зьлёгку паддаты).
Трэці салдацік, які выглядаў, як дух,
апавядаў ім пра возера. Тыя слухалі ўдвух.

*Як? Як ты кажаш? Званы зазьвінелі самі?*
*І патанула? З народам? З папом? З абразамі?*
*А абразы дарагія былі, як думаеш, Лёша?*
*Слухай, няхай малады іх дастане, а нам будуць грошы!*
*Чуеш, што кажуць? Давай! Што «нашто»? А на тое!*
*Правільна, Лёха! Загнаць духа ў возера — гэта сьвятое.*

Тут Лёха сарваў зь яго шыі і кінуў у возера крыжык.

*Плыві за ім сьледам!*
*Пасьля нам раскажаш, дзе быў, чыжык-пыжык!*
*Хутчэй, а то зараз па галаве!*

Дух разьдзяецца, заходзіць у возера, потым плыве.
Трохі адплыў, а пасьля пад вадой зьнікае.
І не вынырвае, сволач такая.

А ў тых кісла робіцца ў роце ад думкі, што скажуць у роце.
Крычаць, разьдзяюцца, ныраюць за духам…
А той незаўважна ўсплывае ў чароце,
хвілінку любуецца іх падводнымі танцамі,
сьмяецца, хапае адзежу й змываецца ў бок аўтастанцыі,
купляе квіток на Карму, а пасьля ўсю дарогу псуе сабе карму,
бо мроіць пра возера, што затапіла б яго казарму.

## 5. ЯК Я ЎПУСЬЦІЎ ВЯДРО

Раз-два-тры-чатыры-пяць —
пачынаю іх зьбіраць.

Нагінаюся за дзедам,
валачу свой посуд сьледам,

і сабранае дабро
гучна падае ў вядро.

Гэта вам ня йсьці ў грыбы,
доўга крочыць на абы.

Тут вы на адным кусьце
цэлы слоік зьбераце.

Нецярплівым проста рай:
нахіліўся — і зьбірай.

Па лістах вяду рукою:
«Выбачайце, непакою!»
—

і ў руках чатыры жмені
застаецца іх, ня меней.

Ах, як радуецца сэрца!

Напаўняецца вядзерца.

А ў вядзерцы не суніцы,
не чарніцы, не клубніцы,

не дурніцы-буякі —
каларадзкія жукі!

***

Засталася чвэрць вядра,
але дзед сказаў: «Пара.

Зараз мы іх будзем трушчыць.
Толькі помні: жук трывушчы.

Лепей трушчыць, каб ушчэнт,
аб асфальт ці аб цэмэнт,

ды патроху, па чарзе».
Дзед гаворыць — жук паўзе

па вядры. Гляджу на вязьня:
«Зараз будзе табе лазьня.

Мой суворы дзед такі.
Беражыцеся, жукі!»

Кожны мітусіўся, кожны

быў такі бездапаможны.

Зрэшты, што я ім, ахоўнік?
І ўпусьціў вядро ў дзядоўнік.

А яны як ламанулі!
Вылятали, быццам кулі.

Мне на хвілю зьнесла
дах, а яны — ужо ў дзядах…

Дзед злавіў, але ня ўсіх.
Дзед сказаў мне, што я псіх.

Дзед паскардзіўся бабулі,
абяцаў пазбавіць бульбы.

Але я не шкадаваў,
што жука пашкадаваў.

## 6. НА КАРОВУ

На ганку, на дзьвюх лавачках за столікам,
сядзелі зь Юрам, Славікам і Толікам
і трэці запар дзень гулялі ў карты:
занятак варты,
калі партнэр упарты й сам змагар ты.
А пойдзе карта — гэта вам ня мапа!
Гулялі ў «гаўналяпа».

На што гуляць, каб сэнс наш меў занятак?
На распрананьне? Дык няма дзяўчатак.
Гуляць сур'ёзна? Скончыліся грошы.
На інтарэс? Занятак нехарошы.
На пстрычкі? Біць сяброў ніхто ня стане.
Сышліся, што гуляем на жаданьне.

Вядома, хто застаўся гаўналяпам…
Каб знаць, што пажадае Толік, — кляпам
заткнуў бы рот, бо ён са мной дарма
так: я быў павінен заўтра пасьвіць статак!

Агульны статак — трыццаць тры каровы,
і раз на месяц — графік несуровы,
як на сям'ю, бо кожная ў чарзе.
(Ухілісься — сумленьне загрызе.
А шчэ суседзі! Шмат бы хто з суседзяў
сумленьне ў справе «грызьці» б апярэдзіў).
Ды нашая чарга яшчэ праз тыдзень,
а Толікава — заўтра. Толік — злыдзень!

Устаць за чвэрць гадзіны пад два гімны.
На мацюкі і туалет інтымны
згубіць хвілінаў дзевяць або дзесяць,
язык і пугу на плячо павесіць —
і можна сьмела шыбаваць на луг з
каровамі і купкай недалуг.

Наперадзе ішоў дзядуля Толіка
хадою вэтэрана й алькаголіка:
шмат ведаў пра жанчын і мэдалі,
каторыя далі і не далі.
За ім — ягоны сябар і пляменьнік,
мясцовы рыбнагляд і шызафрэнік,
па сумяшчальніцтве паэт-аматар:
паслухай верш — дасьць пакатацца катэр.
Наступны — бацька Толі, трактарыст,
спартсмэн і фан каманды «Джудас прыст».
Ягоная палова — цёця Каця,
што працавала ў лодачным пракаце.
Будзь Толік, дык сабралася б сям'я.
І ў давяршэньне ўсёй клаўнады — я.

Ідзем і размаўляем з «рыбнадзорам»:
— Андрэйка, а ты вершы любіш? Сорам!
Як не любіць высокай прыгажосьці?
Вось ты паслухай, пачытаю штосьці:
«А над Чачэрскам зор, нібы гароху!..»

Я ўжо таксама вершаваў патроху

і, галяком купнуўшыся ўначы,
мог у адказ мэтафару сьпячы,
што зор там, як укусаў камароў
на срацы. Параўнаньне будзь здароў?
Ды вернемся з вышыняў да кароў!

Над вухам авадні вясёлай фугай.
Адмахваемся — хто хвастом, хто пугай.
Парнакапытным хораша на траўцы.
Мужчыны абмяркоўваюць, як знаўцы,
далікатэсы з торбы цёці Каці,
якімі ўчора грэбавалі ў хаце.
Салодка сьпіцца на чачэрскім сонцы
пярэстай халмагорцы і херсонцы,
цялушцы Зорцы і старэнькай Лысцы.
Сьпіць вэтэран, як немаўля ў калысцы,
пакінуўшы загад — глядзець Чарнушку,
бо гэта можа зладзіць нам вайнушку:
штодня ўцякае з лугу, чорт рагаты,
і іншых за сабой вядзе дахаты.

«Рагаты чорт» хутчэй была бязрогай.
Штодня ўцякала іншаю дарогай,
ня кожны раз трапляючы дадому.
Шукай пасьля й ці знойдзеш — невядома.
Ну, так і ёсьць. Бяжыць. Забудзь пра стому.

Дарэмна я гуляў у карты ўчора!..
Бягу за ёй, наперадзе Чачора,
фарсірую раку, як быў, у ботах,

лячу ўгару і пераводжу подых
адно каб азірнуцца на пагорку…
«Чорт! Мужыкі, трымайце Лыску й Зорку!»
Ці дзень такі, ці пасьвілі нягегла,
але палова статку такі зьбегла.

Ганяў яе па пустках і садах.
Вярнуўся, згодна з назвай, у дзядах,
зь вялікім гузаком на галаве,
паабстрыкаўшы рукі ў крапіве.
Але злавіў за Замкавай гарой і
потым пачуваўся, як герой.

А цераз тыдзень пасьвіць яшчэ раз…
Пасьля крычаў картыжнікам: «я пас!»
А калі хто казаў: «не на карову»,
я пачынаў сьмяяцца нездарова.

## 7. КАМАНДЗІР БАБСКАГА БАТАЛЬЁНУ

Гэты кашмар пачаўся з прычыны бульбы.
Не, не спаймалі нікога з чужою бульбінай, скуль бы!
Проста адна малая паненка
з прозьвішчам рэдкім на «енка»
(што вельмі важна, пры сымпатычным сьведку)
неяк прасіла сяброўку-суседку
дапамагчы абраць пяць кіло
бульбы, а той было западло.

Першай, вядома ж, крыўдна. Хацела абразіць «сучкай»,
ды выхаваньне ўзяло сваё — абмежавалася «беларучкай».
Гэтая штось недачула, падумала, што «беларускай»,
з намёкам на бульбашоў —
і пачалося шоў.
Тую, на «енка», не пачаставала сушкай,
абазвала «хахлушкай»
і для нагляднасьці — добра агрэла падушкай.

Можа, усё абышлося б, ды сьведка быў сапраўдны ўкраінец,
на дапамогу пакрыўджанай кінуўся, як марскі пехацінец,
вырваў падушку ў злачынкі,
выцер соплі ў пабітай дзяўчынкі
з выглядам малайчынкі, што добрыя робіць учынкі.

А ні халеры!
У «беларучкі» свае кавалеры.
Вечарам ён атрымаў ультыматум на брудным кавалку шпалеры:
«Зафтра ля рова

будзе цібе хярова,
бо ты і сам ідыёд і дзефка твая карова».

Проста існуюць традыцыі
па-за ўладай бацькоў і міліцыі, як шанаваная
тут гадамі ПЕРАСТРЭЛКА ДЗЯДАМІ.

Першы стрэл прыняў на сябе валасаты Данік,
а другі рыкашэтам трапіў Таньцы за станік.
Трэцім стрэлам Славіку з Гомеля ледзь ня выбілі вока.
Славік крыкнуў, што пойдзе дадому, бо нешта моцная сьпёка.
Нос разьбілі малому Ваню чацьвертым стрэлам —
над камандаю гарадзкіх запахла гарэлым,
але ў момант, калі іх войска ўжо страціла трох сяброў,
мой лірычны герой якраз праходзіў паўз роў.

«Нашых б’юць!» — пранеслася ў думках,
а потым: «Куды б схавацца?»
Але раптам заўважыў тую, зь якой ледзь дамовіўся цалавацца.

Тры дзяўчынкі ў адной камандзе, а хлопцаў ужо няма,
і зьяўляецца шанец дамовіцца з тымі дзьвюма.
Як-ніяк у менскіх вайнушках ён быў падпалкоўнікам —
і ён рынуўся ў гушчу падзеяў зь вялікім кустом
дзядоўніка.

*А дзе ж тыя ваяры,*
*Што дзядоўніку сябры?*

*А дзе ж тыя іх дзяды,*
*Што лятуць туды-сюды?*

*Каб ачысьціць гэты рой*
*Ад варожых ваяроў!*

Скажаце, што «кічуха», скажаце, што «бытавуха»,
а ў яго пасьля ад удару з тыдзень гарэла вуха.
Але зараз ён Гойка Міціч і перамогу сьвяткуюць апачы,
і бледнатварыя ворагі дражняцца, адступаючы:
«Камандзір бабскага батальёну, камандзір бабскага батальёну!»

А ён у Чачэрскім раёне — кароль раёну.

## 8. ЯК Я ПРАВЁЎ ЛЕТА

Першыя ўрокі. Мусоліш аловак і сьцёрку.
Тэма на дошцы — пішы, як праводзіў ты лета.
Пішуць, казлы. Ты таксама хацеў бы
«пяцёрку», толькі пра што тут пісаць, як
раскажаш пра гэта?

Як ты глядзеў тэлевізар тайком ад бабулі:
над галавою імгненьні сьвісьцяць, нібы кулі,
ледзь нашы гол у адказ забіваюць
шатляндцам — бабця ў адказ прабівае па
задніцы сланцам.

Як ты з набітых кашоў выкідаеш лісічкі:
месца няма ўжо, а белых грыбоў усё болей.
Як літаральна за тыдзень мяняюцца звычкі і геніяльна
смакуе партвэйн дзядзі Колі.

Як па дарозе дамоў спатыкаўся, бы Чаплін.
Як, пачатковец-нудыст, ледзь ня зьмерз у Сажы
і, каб сагрэцца, — ударыла ў голаў мача,
блін! — сена калгаснага стог падпаліў.
Раскажы!

Як ты глядзеў у кіно «Чалавека-амфібію»,
рот адкрываючы прагна спайманаю рыбаю.
Ўражаны бацька назаўтра купіў табе ласты.
Славік зайздросьціў: «Тапелец, а не вадалаз ты!»

Як з Засажэўскага лесу дамоў на папутцы —
першы твой раз, як сказаў бы цяпер, аўтаспынам.
Як ад дажджу ў тэлефоннай хаваліся будцы
з той, што пасьля назаве цябе сучыным сынам.

***

Дзе гэта ўсё? Аўтастанцыя. Ціша. Бязьлюдна.
Цераз пітомнік (бабуля казала «пітоўнік»)
крочыш паволі. Зьмянілася ўсё абсалютна.
Толькі дзядоўнік, дзядоўнік, дзядоўнік,
дзядоўнік.

Пафарбавалі ў зяленіва дом бабы Валі,
вуліцу неяк бяздарна заасфальтавалі,
роў закапалі — і не засталося сьлядоў.
Толькі дзяды, нібы ўнукі тых вашых дзядоў.

# V.

# ДЗЕВЯНОСТА ДРУГІ ДЗЕНЬ ЛЕТА

## ПСІХААНАЛІЗ

Упершыню цалаваўся ў дзіцячым садку:
сярэдняя група, сярэдзіна ціхай гадзіны.
Дзеўчына доўга трымала мяне за руку,
потым прызналася: я ў яе не адзіны.

Упершыню мяне моцна пабілі ў старэйшай
групе — тая дзяўчынка, зь якой цалаваўся ў сярэдняй.
Я наглядзеўся tv — і назваў яе гейшай.
Гейша таксама глядзела tv. Бойка была канкрэтнай.

Упершыню пасварыўся зь сябрам у першым класе,
дзеля дзяўчынкі, зь якою біўся ў старэйшай групе:
«Ты ж мне пакляўся! Я ж на цябе паклаўся!
Што робіць ейны волас у гэтым гарохавым супе?!»

Упершыню спавядаўся, мыючы сходы за шатняю,
сябру сяброўкі на тэму сяброўкі сябра.
«Сёньня дала мне…» — кажу. Патлумачыць «…дала сьпісаць хатняе»
я не пасьпеў — перашкодзіла сябрава швабра…

Дваццаць гадоў мінула — і вось, ляжу на кушэтцы
сябра-псіхааналітыка, што зламаў аб мяне
некалі швабру: «Ты тут ні пры чым. Я ня верыў Сьветцы.
Дзеўкі няверныя. Здрада не абміне.

Я таксама герой. На тую цягне, да гэтай хіліць.
Хоць ты жаніся зь першаю выпадковаю.

Пабяруся з балгаркай — і хай мяне пiліць!
Пазнаёмлюся зь фінкай — і хай падколвае!

Сьветка ж (ты сьведка!) заўжды карысталася попытам.
У адзінаццатым класе скокнула ў даўжыню.
Прызямляецца. З попы пясок атрасае. А попа там!..
Дваццаць гадоў мінула, а бачу, бы ўпершыню».

Хутка пясок будзе сыпацца, а ён пра дзіцячыя дупы.
Слухаеш — і ня ведаеш, хто аналітык, хто псіх.
Раскажы пра садок. Інвалідам сярэдняй групы
хопіць кушэтак. На ўсіх.

## ДЗЕВЯНОСТА ДРУГІ ДЗЕНЬ ЛЕТА

*Сяргею Прылуцкаму*

Дзевяноста другі дзень лета — прывітаньне школе і верасьню!
Упадаю ў дзяцінства, кладуся й сябе яшчэ да ўнівэру сьню.

Ані згадкі пра першага верасьня, помню толькі раніцы ўзімку,
калі мама гаворыць «пад’ём», а я ў позе марфэя з падушкай ў абдымку.

Душ, сьняданак са смакам зубное пасты і перад дарогай легальная кава…
Аднакласьніцы ногі дастануць з-пад футра: чым вышэй, тым болей цікава.

І заняткі, дзе нафта — бяз коштаў, а кокс — гэта ўсё яшчэ кокс,
і сябры ў перапынку паказваюць постэр з красуняй Самантаю Фокс…

А назаўтра я зьехаў у вёску, дзе сьнегу да самых стрэх,
і два тыдні вакацыяў сьніў сябе зь ёю на постэры — сьмех і грэх!

Ну, вы толькі ўявіце нас разам, якія мае, блін, шанцы:
яна ў стрынгах і топлес, а я ў паліто не і шапцы-вушанцы!..

Мэдагляды й прышчэпкі — ня тыя, што ў ваннай, зусім ня тыя!
Цёця доктар, а зь ёй мэдсястра, і абедзьве яшчэ маладыя.

І адна як на постэры, толькі ў халаце, дарэчы — кароткім.
І са мной адбываюцца дзіўныя рэчы, заўважныя гэтым цёткам.

І тады я на радасьць фрэйдыстам крычу, што баюся ўколу…
Прачынаюся… шчасьце… мне 34 — і болей ня трэба ў школу!

## ВЫХАВАНЬНЕ ПАЧУЦЬЦЯЎ

*І толькі ў хваляваньні скуб рукаў,*
*Калі цябе да дошкі выклікалі.*

*Рыгор Барадулін*

Школа, дзе я вучыўся, была сярэдняй —
якраз пасярэдзіне між кальцавой і цыганскім пасёлкам.
Бяжыш папаліць у лясок, а там ужо вучні суседняй: маглі
пазнаёміць зь цёлкамі, маглі і аттырыць з толкам.

Ваянрук па мянушцы Дзот калашом наводзіў парадак,
фізрук па прозьвішчы Пшонка
трапляў ува ўсе баскетбольныя кольцы,
піянэры на лесьвіцы ціскалі акцябратак,
піянэрак за шатняю ціскалі камсамольцы.

Школа ігнаравала нашы дурныя жарты.
Вучні ўдавалі, што не разумеюць кпінаў.
Але аднойчы мой аднаклясьнік запусьціў у настаўніцу партай —
і былі тыя, хто шкадаваў, што ён не дакінуў.

Мы добра ведалі, што ў нас называюць капустай,
а вось пра дзяцей у капусьце бацькі нам не расказалі.
У нас не было басэйну для знаёмства з распустай,
таму хараство дзяўчатак мы адкрывалі ў спартзалі.

Раз на фізры, калі мы ўсім класам поўзалі па канаце,
я завіс — ні туды, ні сюды — паміж падлогай і стольлю,
і ты раптам спыніла ўвагу на маёй клаўнадзе:
а хто там вісіць дагары нагамі й не наракае на долю?

Я пачуў тваё рагатаньне — і ляснуўся долу на маты.
Покуль Пшонка нешта крычаў, а пасьля перайшоў на маты,
ты пяшчотна сказала «прыдурак», унушыўшы адной ухмылкай,
што маё зьяўленьне на сьвет не было фатальнай памылкай.

Я ня мог да цябе павярнуцца сьпінай і не наважваўся тварам,
адчуваў сябе закаханым у прыгажуню пачварам.
Сэрца білася ў захапленьні, варта толькі вачыма сустрэцца, як —
уваскрэсьлі боства й натхненьне, і жыцьцё, і сьлёзы, й эрэкцыя.

Каб цябе ўратаваць ад адказу з двойкаю немінучай,
я гатовы быў зьесьці твой дзёньнік і крэйду разам з анучай.
Я табе падказаў усе даты па гісторыі Рыма і Грэцыі,
а потым катаў на раме – на злосьць дзяржаўтаінспэкцыі.

Мы езьдзілі разам трамваем, пасьля ў падземным вагоне
(якраз нядаўна пусьцілі мэтро), палілі ў цябе на балконе,
на тваім дні нараджэньня я насьмяшыў тусоўку
і — вяршыня інтымнасьці — пазычыў табе насоўку.

Ты плакала — я выціраў. Ты мне казала: «Ня трэба».
Казала, што хутка зьедзеш, бо тут савок і імпэрыя.
А потым: «Дурны, я кахаю іншага. Табе да яго, як да неба».
Я паглядзеў на неба, халоднае, нізкае, шэрае.

## НВП

*Зьмей сярдзіты вельмі, падла*

***Стары Ўлас***

Хочаш загадку? Ты — кавадла, ён —молат?
Не здагадаўся? Савецкага войска волат.

Не пераблытай: ён — молат, а ты —кавадла!
Правільна, ваянрук. Вельмі сярдзіты, падла!

Хутка пашыхтаваў вас у дзьве шарэнгі.
З гэтага пачаліся твае мітрэнгі.

*«Сьмірна! Разь-лічысь на першы-другі!*
*Як маршыруеш, прыдурак? Зь якой нагі?*

*Што за прычоска? Да заўтра пастрыгчы патлы!*
*Паадчувалі свабоду, — і шэптам, — падлы».*

Надзяваць супрацьгазы, яны ж «адгазьнікі» —
гэта вам не падкрэсьліваць дзейнікі і выказьнікі.

— *Хто найлепшы сябра салдата?*
— АК-47, таварыш палкоўнік!
І АКМ, яго вучань і пасьлядоўнік!

Так, «калашнікаў» — гэта зусім не купец.
Не зьбярэш усьляпую — табе капец!

Твой умоўны праціўнік — Пятрова Каця.
Што зь ёй рабіць — глядзі на гэтым плякаце.

*«Я сказаў, не сутуліцца! І прыбяры жывот! Помніце,*
*вы тут — ня клас, вы тут — узвод!..»*

Так, за ўсю маю школу, мне першы раз
спадабалася падазронае слова «клас».

## УРОКІ СЬПЕВАЎ

Колькі год запар на дзень нараджэньня з раніцы ў электрычцы,
мроячы пра стоп-кран у вушах, каб хоць на хвілю — ціш.
Перакрыкваючы рынгтон з «калі вам крыху за трыццаць»,
хлопчык-жабрак сьпявае: «дзяцінства, куды ты ляціш?»

А і напраўду, куды? Бо пацану на мыліцах
ні пабегаць па дахах, ні паганяць галубоў.
Хто наагул дакладна скажа і не памыліцца,
з кім плюсаваць Наташку, каб у суме любоў?

Помню, настаўнік сьпеваў, што кіраваў нашым хорам,
на сьвята савецкай арміі вадзіў нас на вінзавод,
потым зьнікаў і вяртаўся чырвоны, а хлопцы зь нямым дакорам
глядзелі яму наўздагон, набіваючы тортам жывот.

Помню Пятра, ударніка працы і проста ўдарніка:
так граў на вясельлях, што фаны не адпускалі ў WC.
Пяяў для нас, як прапаў сабака, а потым разам з напарнікам
прапаў — і толькі праз тыдзень абодвух знайшлі ў рацэ.

На дзень нараджэньня паштоўкай паслаў запрашэньне сяброўцы.
Яна прыйшла ў такім макіяжы, што ясна: мама — грымёр.
У самы разгар нашых сьпеваў сусед па пляцоўцы
ня вытрымаў: «Хулі шуміце, учора Андропаў памёр!»

Але ў аматараў цішыні надзвычай крыклівыя дзеці.
Ягоны сын вучыў мяне гульням, да якіх я ня звык:

скакаў па дошках і гучна пяяў:
«ЯК ХОРАША ЖЫЦЬ НА СЬВЕЦЕ!»
Я радасна скочыў за ім на дошку — й нагой напароўся
на цьвік.

Успомніць жахліва, як потым да ліфта адольваў сходы.
Нават цяпер згадаю — і правы ступак памацаю.
Зрэшты, а як іначай было дабіцца, каб я заўсёды
помніў пра песьню хлопца, што стопудова меў рацыю?

## **РАДЫЁ-ВІЁН**

*Mais ou sont les neiges d’antan?*

***Франсуа Віён***

*О, как похож ты, тающий снег…*

***«Ласковый май»***

Хлопец насупраць — ня супэр-зорка, дзяўчынка яго — ня мэга,
але, пяшчотна абняўшы, яна гаворыць яму:
«Мама казала, праз сорак дзён пасьля першага сьнегу выпадае
сапраўдны, каторы — на ўсю зіму.

Першы быў пазаўчора, я падлічыла — і, ведаеш,
гэта зіма пачнецца якраз трыццаць першага сьнежня.
Той Новы год быў нейкі ня вельмі вясёлы, у гэты ж
так пагуляем, што дворнікам зранку будзе ня сьмешна!»

Я пагуляю таксама. Хай сьнег замятае дарогу,
што перайду, каб дрэнных прыкмет не баяўся сустрэчны кот.
Буду брысьці па леташнім сьнезе і згадваць сабе патроху
тых, якія мінулі, як гэты год.

Дзе прыўкрасная А., выдатніца па фізкультуры?
Як аблягалі попку яе трусы!
Як яна танчыла пад «You My Heart» са школьнай апаратуры,

за вялікія вушы закінуўшы валасы!

Дзе чароўная Н., што ведала ўсе памеры
і вершавала пра маці, радзіму і ўсё такое?
Я хацеў яе… Н. разгадала мае намеры —
і пасьпявала схавацца ў піянэрскім пакоі.

Дзе дзівосная М., што ў інтэрнаце шпалеры
клеіла разам са мной, каб квітнеў унівэрсытэт?
Я не заўважыў, як трапіў да яе ў кавалеры,
і ня ведаў, што трэба рабіць, застаўшыся тэт-а-тэт.

Дзе спакусьніца І., што езьдзіла з намі на бульбу
і не здала іспытаў, нарадзіўшы дзіця?
Я напісаў ёй агульны сшытак вершаў і — mea
culpa! — так і не перайшоў ад паэзіі да жыцьця.

Дзе неймаверная В. з Крыжоўкі на Менскім узмор'і?
(Брат, лейтэнант ГБ, пагражаў, што мяне дастане).
Потым я бачыў яе ў праграме «Прагноз надвор'я»:
нешта пра пацяпленьне й сьнег, каторы растане…

Хай ласкавы шансон у кавярні гучыць папсова,
покуль зь дзяўчынкай цалуецца маладзён.
Кожны леташні сьнег растане своечасова,
каб нам было што ўспомніць праз сорак дзён.

## НЕ ТРАМВАЙ

калісьці пра ўсё, што рухаецца, казаў: «не трамвай — аб’едзе!»
бо ўсё, што тады аб’яжджала, рухалася цішэй
цяпер ён так не грукоча: ці мне mp-3 мядзьведзі
наступілі на вушы, ці ён — у аб’езд вушэй

на задняй пляцоўцы ў трамваі была чароўная скрыня
з раніцы па дарозе на трэніроўку ў манеж
сядзеш — і вешай на вушы лене або марыне
а ня ўразіш лапшою, то хоць сам не засьнеш

у маёй спадарожніцы вусны ў салодкай атруце
сябра казаў: «яна ж страшная! дурань, ты што — асьлеп?»
потым яна сап’ецца: на чацьвертым маршруце
папрацуеш кіроўцам — ведаеш, што за хлеб

па ліманад у краму — як гульня прызавая
у безьбілетных кішэнях зьвінела лішняя медзь
а што было ў скрыні на задняй пляцоўцы таго трамвая
яе спытаць не даўмеўся, самому ж не зразумець

## КУБІКІ

сон зялёнага школьніка — пяшчотная мясарубка
цэлая ноч сэрыялаў, лаціна-
амэрыканскія горкі
калі прачынаесься ад пачуцьця, што паміж ног кубік рубіка
а настаўніца мовы практыкуецца ў хуткасьці зборкі

тры гадзіны ў чарзе — чым не павольныя танцы?
калі дэфіцытныя кубікі завезьлі ў краму — авохці!
і раптам цябе прыціскае натоўпам да ўлюбёнай настаўніцы
што стаяла таксама й нэрвова грызла пазногці...

мы неяк сустрэліся — тая ж красуня й дагэтуль пазногці грызе
ўсьміхнулася так, што ў тыя часы не адзін звар'яцеў піянэр бы
«а помніш, як мы калісьці па кубік стаялі ў чарзе?
ведаеш, я і цяпер кручу, так супакойвае нэрвы»

праца выкладчыцы ў школе рэдка бывае моднай
на беларускія вершыкі часу надзвычай мала
зрэшты, маёй настаўніцы, дзесяць гадоў як самотнай
лепш не чытаць, што за цацку ў руках
яна дваццаць гадоў трымала

## ВЕРШЫК ПРА САНКІ

калі мама з татам табе куплялі першыя санкі
ты ведаў, што будзеш катаць усіх дзяўчат у двары
потым, калі жыватом аб ваду навярнуўся з тарзанкі
ты ведаў, што ёй цікава — патонеш ці не ў віры

калі ў школьным ціры наўмысна паліў па мішэні
ад якой не пасьпеў яшчэ адысьці ваянрук
ты ведаў, што будзе адразу пасьля, а потым твае кішэні
стануць сховам ад ветру для самых прыгожых рук

калі крэмзаў парту сьцягнутым дома сьцізорыкам
і зь непераможным кампом змагаўся ў шахматы й го
калі на мяжы скандалу спрачаўся ў класе з гісторыкам
адзін гісторык у класе ня ведаў, дзеля каго

і хай аднакласьнік з парыжу сёньня глядзіць з дакорам на
«баралускага» лузэра, што робіць ня тое з жыцьцём
а ты глядзіш, як дачка глядзіць на хлапцоў, — і ня сорамна
перад ейнаю мамай — ты быў нармальным дзіцём

## ДОЎГАЯ ДАРОГА ДА ГАРШКА

а здорава было б узяць і напісаць сямейную сагу
пра бацькоў і дзяцей і назваць яе «доўгая дарога да гаршка»
тамоў так на сто пяцьдзясят прывітаньне бальзаку
калі ў друкарцы і ў аўтара хопіць на ўсё парашка

капітальна прадумаць розныя сюжэтныя адгалінаваньні
каб плынь сьвядомасьці бараніла віры свае
каб каханкі ў ложку шкілеты ў шафе тапельцы ў ваньне
і духоўнасьць духоўнасьць духоўнасьць а як безь яе

вось скажам філфак універу да самай спартзалі набіты німфэткамі
з гарадзкою прапіскай current music: на мурамскай дарожцы стаялі тры
ён знаёміцца і адразу ж пачынае яе параўноўваць з рознымі кветкамі
бо ён тут адзіны зь вёскі яму сямнаццаць столькі ж александры…

ён з маленства аматар броўкі яна мае пірсінг на броўцы
кажа што кветкі выклікаюць у яе іншы асацыятыўны шэраг
яны нешта п’юць ён прачынаецца зранку на ейнай сяброўцы
яна дарыць яму пацалунак ён згадвае аб людажэрах

яна кажа што ейныя бацька і брат толькі што селі
за групавое забойства яе папярэдняга жаніха
і пакуль яны там трэба хутка згуляць вясельле
як гэта ледзьве знаёмыя? а каму я тады да раніцы ладзіла вднх?

трыццаць дзьве незамужнія аднакурсьніцы вялі іх замест канвою
адзінаццаць абкураных дваццаць адна бухая
і толькі пад праваслаўнай былой уніяцкай царквою

ён зразумеў што напраўду кахае

гасьцей панаехала цэлы аўтобус як на экскурсію
апошні раз ён так хваляваўся калі вучыўся браць акорды з барэ
празь дзевяць месяцаў яна мела найпрыгажэйшы жывот
на курсе хлопчыку ў гонар здадзенага іспыту далі імя анарэ

ад крыкаў маленькага генія зранку расколвалася башка
але гэта палова бяды бо нягоднік паставіў мэтаю
з паўгадзінкі паседзеўшы марна пасьля пакакаць міма гаршка
разоў гэтак сто пяцьдзясят каб бацькі чалавечую мелі камэдыю

і вось зь яго вырас батан-выкладчык пад гучны гоман
ён сочыць як у студэнтак сыходзіць румянец са шчок
покуль ён валіць ім мантру: рамантычны энтузіязм іронія гофман
і залаты гаршчок
залаты гаршчок
залаты гаршчок

## ФАЛЬШЫВЫЯ СЯБРЫ ПЕРАКЛАДЧЫКА

Ён верыў у Дзеда-Мароза, яна ў выкраданьне Эўропы,
яго бацькі ў камунізм, яе бацькі ў гараскопы.
Ён — лютаўскі Вадалей, яна — верасьнёвыя Шалі,
і ейныя тата і мама яго на першых парах запрашалі.

Ейныя продкі былі элітай яйкагаловай:
бацька — доктар навук, маці — проста мэгэра.
А кавалер іх дачкі меў тады восем з паловай,
і ўсе яго звалі Гоша, яна ж называла — Гера.

Яна ў свае сем была вундэркіндам і нават ведала троху
лаціну. Сказала яму: «Carpe diem! Перакладзеш з Гарацыя?»
Ён дома аскуб адрыўны каляндар. Пасьля стаяў на гароху,
бо бацька ня трапіў тады на цягнік, а ў бацькі рука гарачая…

Праз дзесяць гадоў ён сустрэў яе на ўзьбярэжжы Юрмалы.
Убачыў — і крочыў за ёю ў ваду, адчуўшы юр не малы.
Яна крычала: «тану!», а ён: «не патонеш, мячык!» — і
перакладаў яе з хвалі на хвалю, як перакладчык.

Яна яму: «што ты робіш?», а ён у адказ: «то и делаю!» –
і цалаваў яе проста ў Балтыйскае мора.
Потым ён жартаваў, што вышэйшы на цэлую
галаву. А яна яму: «Цэлую? Ты ж на яе — хворы!»

Ейны бацька сказаў: «Валіў бы ты ў войска, лепш у памежнікі!»
Ён адказаў: «Carpe diem! Гэта з паэзіі Рыма».

Потым дадаў: «Вы — вяршкі грамадзтва, мы — яго
вершыкі». Потым ляснуў дзьвярыма.

Ейная мама на кухні да ранку рыдала, як плачка,
павучала дурніцу восем гадзінаў запар:
«Доча, калі ты хочаш у лінгвістычны на
перакладчыка, ён — твой фальшывы сябар!

Хочаш на перакладчыка — менш паэзіі! Хочаш
у лінгвістычны — сябруй з галавою!»

Уночы яна прысьніла, што яму галаву адрэзалі,
і яна размаўляла зь ёй, як з жывою,
любавалася ўсьмешкай зь беларусьфільмаўскім прыкусам
і пахавала ў вазоне з маміным фікусам…

Хтось назаве ўсё гэта казкай ці містыкай,
іншыя скажуць: «Жыцьцё — тэатар, які пачынаецца зь вешалкі».
Сёньня яна працуе высокааплатнаю сынхраністкай.
Ён сядзіць у яе на шыі, перакладаючы вершыкі.

# VI.

# НАЧНАЯ СВАБОДА

## РЭЙКАВАЯ ВАЙНА

Калі прачнесься апоўдні, а ўстанеш а сёмай, на жаль,
у вуху — вока тайфуну, а ў воку рыдае плачка,
і ранак вітае гімнам, нібы ў кустах раяль,
і струны яго, як нэрвы, патрабуюць наладчыка.

Твар яшчэ не паголены, шыя яшчэ не намылена,
і фрызуру «раніца ў лесе» маеш на галаве,
а дзесь на вакзале стаіць электрычка —роўная, нібы зьвіліна.
Што на раскладзе? Вось мая — восьмая дваццаць дзьве!

Зранку ў мэтро — паэма: пэнсіянэрка-эма,
з галавою накрыўшыся фіялетавай чолкай,
як на падушцы, соладка сьпіць на рэкляме брсма…
Выхад. Вакзал. Электрычка. Дзюбай ня шчоўкай!

Галасы карабейнікаў пракручваюцца, як стужка.
Забаўляльным чытвом у дарогу набіты валізы:
«для аматарак пахудзець — «Камсамольская праўда талстушка»,
для астатніх жанчын — часопіс «Бедная Ліза»,

для адзінокіх мужчынаў — эрачасопіс «Сон в руку», для
самураяў і гейшаў — бансай, судоку, сэпуку,
адрыўныя календары — дачнікам і агароднікам,
газэта «Народная воля» — няўдачнікам і гаротнікам».

«Зранку з пахмельля захочацца піць рыбам і вадалеям:
змажце набытым у нас мамэнтальным клеем

таксама набыты ў нас плястыр зь цялесным колерам —
і заклейце ўсе рыльцы пляшак з усім алькаголем…»

Ад цёплых, душэўных словаў мат запацеў на шыбах.
Назва патрэбнай станцыі абуджае, як выбух.
Лячу пад адхон на свае Жданы,
цягну за сабой недасьнёныя сны.
Лічыце мяне ахвярай рэйкавае вайны!

## ВЫПУСКНІКАМ ЛІЦЭЮ

Не перамайся, твая электрычка і сёньня прыйдзе:
дваццаць хвілін па веды з дачнікамі й бамжамі,
а потым — за тры пагоркі — будзе сядзіба ў прыгарадзе
і падпольныя словы, якія ты любіш вушамі.

Прывыкаеш да добрага — і не губляеш звычак,
хоць зададзена столькі, што прачытаць немагчыма.
Сьвятам першага верасьня будзе табе кастрычнік,
будзе расклад заняткаў —пад расклад электрычак,
і падпольныя людзі, якіх ты любіш вачыма.

А таму прачынаесься і разумееш, што ўсё не
так ужо і херова — дыхаць смачна і вольна!
Не перамайся, твая электрычка прыйдзе і сёньня:
большасьць ведаў у гэтым жыцьці ты атрымаеш падпольна.

## НАЧНАЯ СВАБОДА

начную свабоду сустрэну ў далёкай вандроўцы
а потым вязу празь мяжу кантрабандны тавар
начная свабода ня ведае правілаў руху і нават кіроўцы
вялікіх зялёных машын яе помняць у твар

начное свабоды ня знойдзеш у краме і храме
а той хто надумаў шукаць — адмарозак і псіх
начное свабоды ў прагнозах і тэлепраграме
няма бо свабода — начное кіно не для ўсіх

начная свабода ня гульні ў лядовым палацы
начная свабода ляціць міма кортаў у аўт
начная свабода з табой замярзае ў палатцы
а ты не сагрэеш бо ты не найлепшы бойскаўт

агонь запальнічкі асьвеціць свабоду начную
захочаш сказаць ды запнесься губляючы ніць
яна пачастуе гарбатаю і цыгарэт прапануе
і я ўпершыню пашкадую што кінуў паліць

начная свабода сьпявае паскуду й герою
і той хоць ня ведае словаў паўшэптам пяе
начная свабода прысьніцца аднойчы і кожнай парою
і кожнаю пораю году чакаеш яе

над змрочнаю зонай лунае пакуль безназоўнай
адно выпадковы самнамбула выгукне: «ваў!»

прыўкрасная жабка ці зробіцца ўрэшце князёўнай
зьдзяйсьняючы мары таго хто чакаў і трываў?

***

Калі ад тэленавінаў сьнег выпадае ў асадак,
хоць мала хто сумняваўся ў прагнозах на гэты конт;
калі мэтрапалітэн працуе безь перасадак,
а нехта па тэлевізары ратуе ўласны азадак з экрана
ля дому з надпісам ГАРЫЗОНТ;

калі шмат тысяч мабільнікаў разам лічаць гадзіны,
тым болей ад іх на плошчы ніякай іншай карысьці —
стаяць і чакаць свабоды, бо выбар цяпер адзіны,
у велькім і бардза пажондным, хто б там ні
трындзеў, таварыстве;

абуць на тры пары шкарпэтак цяплейшыя боты,
на злосьць халоднай вайне й атмасфэрнаму фронту,
бо выбар цяпер адзіны — стаяць і чакаць свабоды —
ад лесьвіцы ў стылі ампір да самага ГАРЫЗОНТУ.

*20 сакавіка 2006*

## ПЯЦЬ ДЗЁН

пяць дзён ад рана да рана
твой горад дыхаў з апаскаю
твой горад горад тырана
вучыў альбанскую

ля ГУМа ўжываюць гуму
будуюць жывы рэдут
а горад
твой горад
падумаў
«ученья идут»

мільёны дуль у кішэні
зь мільёнаў вуснаў ні гуку
так гэта былі вучэньні
падзякуй ім за навуку

навуку вымавіць «годзе!»
навуку выгукнуць «хопіць!»
твой горад горад у горадзе
якога ніхто не захопіць

## МАЛАДЫМ ЛІТАРАТАРАМ

Мы вернемся сюды на
танках, на коласах,
купалах, цётках, на
плястылінавых чытанках, на
першых сакавіцкіх фотках.

Нам геній гораду заступнік.
Мы разьбярэмся, *што тут ё*.
Расставім кропачкі над «ё»
і пакаштуем іхны крупнік
пад лёзунгам «любі сваё».

Каб нецьвярозых беларусаў
хістала, быццам на прычале,
і п’яніцы з вачыма трусаў
«in Vilnia veritas!» крычалі.

# VII.

# ДЖЫНГЛ БЭЛЗ

## ШЧОДРЫ ВЕЧАР

Вечар на мытні. Каталікі п’юць заварку.
На ўкраінскай, вядома, *сідають їсти*.
На беларускай, магчыма, кульнулі чарку.
Добра ім, бульбашам, яны атэісты.

Сьнег на заставах такі ж, як у Вільні й Рызе.
Зорнае неба гоніць думкі аб хлебе.
У Эўразьвязе эканамічны крызіс:
эканомяць сьвятло — і зоркі відаць лепей.

Трое бадзягаў. Два зь візамі, трэці бязь візы.
Твары такія, што можна крычаць «горка!»
Кажуць, па Эўраньюс выступалі ганцы зь Пізы,
быццам на ўсход ад шэнгену гарыць зорка.

Пэнсіянэр-фальксваген — нібы вярблюд аднагорбы.
Фатаробат кіроўцы вядомы мясцовым уладам.
На рухомую стужку складаюць свае торбы.
На маніторы ў мытніцы: золата, сьмірна, ладан.

Першы з пакетам прэзэнтаў. На пакеце багоўка.
Ясна, што зь беластоцкага супэрмаркету. Пагаварым-с?
Пан Бальтазарскі Караль, дзе ваша страхоўка?
                                        Мэта паездкі?
Пішыце «зорны турызм».

Вы, Мэльхіёрас Валхваўскас, пачаму без

візы? Па ксэраксе?! Групавой?!! Трохгадовае даўніны?!!!
Хто падпісаў дазвол? Генэрал-лейтэнант Анубіс?
Так, харэ выдурняцца. Ну вы й зьвіздуны!

Раптам: «Здароў, Касьпяровіч! Зямляк! З-пад Валожына!
На Каляды дадому — у нашым стылі…»
Тут здараецца цуд, хоць і не паложана: ўсіх траіх — нават
лабуса — прапусьцілі.

Раждзжаство ў Беларусі? Будуць прыгоды на сраку вам —
падарунак для мага. (Валхва? Караля? Зьвіздуна?)
Недзе над Ракавам
вернікам і абыякавым,
нібы зорка зь ялінкі,
сьвеціць яна.

## КАЛЯДЫ. ВЯРТАНЬНЕ

Калядныя віншаваньні — ня проста піўная рэкляма,
калі з гразёй на асеньніх ботах па лужынах ходзіць зіма.
Знаёмая кажа, што сьнег у Варшаве і ў Лёндане,
мабыць, таксама,
а ў Менску тры дні да Калядаў, а сьнегу яшчэ няма.

Сьвяты Мікалай з падарункамі вяртаецца ўвечары з рынку
прыгараднай электрычкаю на дваццаць чацьверты пуць,
бо ўночы калядныя мары абудзяць адну дзяўчынку,
а тата з мамай ня чэшуцца і спакойна храпуць.

У замежных паштоўках — шчасьце ў вершах і прозе,
у замежных кнігарнях — паліцы сьвяточных тамоў,
а нашы сябры і сямейнікі збольшага ўсе ў дарозе,
і яшчэ невядома, ці пасьпеюць дамоў.

Бо тонны вільготнай восені павісьлі над галавою,
бо хмары ў паветры — як радыё нянашага настальжы.
І едзеш з восеньскай Вільні восеньскаю Літвою…
І сьнег пачынае падаць на беларускай мяжы.

А дома чакаюць прэзэнты каля каляднай ялінкі
і ў пляшках закаркаваныя сьвяточнай радасьці хвалі, —
калі ўсенародны блазан высуне галаву з тэлескрынкі,
а мы ў адказ: «Позна, дзядзька, нас ужо віншавалі!»

## ДЖЫНГЛ БЭЛЗ

Калі сымпатычны атрамант неба зазьзяе сьвяточным надпісам,
калі фігурыстка-зіма размалюе вокны галяндзкім сьцізорыкам, —
на кожнай ялінцы запаліцца Бібліятэка й запахне канабісам
да самых вышыняў, і весела-весела зробіцца зоркам.

Агні на ялінках падсьвечваюць апошнія ночы сьнежня.
З апошнім ударам курантаў замежныя скончацца візы.
Але ты сёньня ў гуморы, і робіцца нават сьмешна,
як Ірад рыхтуе свой хор да дзіцячае Эўравізіі.

Сьнягурка-мулатка сьпявае калядкі, як Джэніфэр Лопэс,
і сьнег падазрона кладзецца дарожкамі ёй на дрэды.
А Дзеду-Марозу ўсё роўна: яму падабаецца хлопец,
у беларускім садку на ранішніку сустрэты.

А ў небе ўсё весялей, і добра сьледам за зоркаю
з бутэлькай «Тры каралі» па сьвеце ісьці паломніку.
Сьняжынкі — як лёд у шклянцы: глыток — і адразу торкае,
і, тонучы ў гэтым кактэйлі, хапаесься за саломінку.

І нехта заняты гатоўкай ці ў краме разьвітваецца з гатоўкай,
і нехта ў зімовым футры ў чужой заначуе ваньне.
А сьвяты разгортваюць сьвет каляднай паштоўкай
і бэтлеемскай асадкай пішуць табе віншаваньне.

І зноўку бяжыш дадому, і сэрца, як колісь, ные,
і сьлёзы, як некалі, замярзаюць у куточках вачэй.

І Новы год набліжаецца, як гопнік з паліфаніяй,
і — звон зьвініць, звон зьвініць, звон зьвініць званчэй!

## ЗАКЛІНАНЬНЕ СЬНЕГУ

*1.*

Падпісацца на сьнег —
не штодзённы, хаця б штотыднёвы,
падпісацца да самай вясны —
пэсымістам на зьдзіў,
і чакаць, калі зьявіцца —
белы, пушысты і новы,
і сварыцца хадзіць на паштамт,
*бо наперад плаціў!*

*2.*

Бязь сьнегу нават пэйзажы робяцца ню.
Чаканьне зімы, як п’есу, чытаем па ролях.
Уночы прысьню,
што крычу мінакам «лыжню!»
і расьсякаю зь вінтоўкай
на лыжаролерах.

*3.*

Наварожыш ёй трохі сьнегу, бо
трохі сьнегу — амаль сьвятло.
А назаўтра крык: «А назад слабо?
Замярзаю! Зрабі як было!»

***

Я ўваходзіў замест шалёнай вавёркі ў кола,
гнаўся за трэцім зайцам і верыў, што карта ляжа.
Блытаў паняткі «лажа» й «вышэйшая школа»;
ведаў, што школа жыцьця — яшчэ большая лажа.
Пару вясновых тыдняў жыў на адрэналіне.
Пару сяброў-беларусаў ушчэнт абруселі.
Спаў на двух’ярусных нарах — на шчасьце, ў Бэрліне;
піў на ўручэньні прэмій — на жаль, не ў Брусэлі.
Нехта пляткарыў, што быў пазбаўлены працы,
ўлетку шукаў гарналыжных схілаў ля Сілічаў;
злыя людзі гавораць: хварэў на пранцы;
добрыя людзі кажуць, што доктар вылечыў.
Не напісаў за год ні даноса, ні палітвязьню:
прозаю ад рукі — не хапае трываньня.
Не пайшоў 31 сьнежня ў лазьню,
вось і пішу гэты вершык алоўкам у ваньне.
Навагодні балянс падвесьці няцяжка:
зноў адчуваю сябе ня хамам, але й ня панам,
а хутчэй гатовым да выбуху, нібы пляшка
з антысавецкім шампанам.

*31 сьнежня 2006*

## С+Н+Г

Калі Новы год стаў стары, ён сустрэў непазьбежнае з гумарам.
На пэнсію выйшаў. Засеў за чытаньне. Вывучыў слова «аксюмаран».

Бо ён стаў такі ж, як гарачы сьнег або прафэсійны аматар, Другі
Прэзыдэнт Беларусі й квадратны ілюмінатар.

Ён ведае ўсё, што ведае старасьць, і можа, як маладосьць.
Спытаюцца: «Ёсьць бухло?» Адкажа: «няма» і «ёсьць».

Спытаюць пра сьпёку — адкажа: «У нас таксама залева». Ідзе
направа — песьню заводзіць, і байкі баіць налева.

Ён сьмела залезе ў палонку з варам, пятая кропка зробіцца тварам, і
брыдкая прыгажуня зноў стане прыгожым пачварам.

Ён нават прысьніў, што нейк удалося злаўчыцца — і ён цяпер геній і,
адначасова, злачынства!

Што ён сякера — і бабця-ліхвярка, чарка і скварка, пастух і
сьвінарка, цяжкая прамысловасьць — і сельская гаспадарка.

Яму за маральную шкоду дадуць трохі газу з усходу, якога хопіць
якраз да новага Новага году.

А ён зьмяшае «савецкі шампунь» і бальзам, два ў адной пасудзіне —
і вып’е за тое, што наша жыцьцё не канчаецца першага студзеня!

# VIII.

# ЗЯЛЁНАЯ ГАРБАТА

***

покуль надвор’е хваліце покуль з гораду валіце
сонца шырока прымружыла вока зьдзіўленага кітайца
скошаны месяц травень сохне на менскім асфальце апошні
вясновы дзень на салодкае вам пакідаецца

усе дзьмухаўцы патанулі ў белі жоўтай падводнай лодкаю
а ты па траве бяз ботаў як апошні шавец
покуль вясновы дзень пакідае цябе на салодкае
а потым падымецца вецер і будзе табе дзьмухавец

пахі травы і бэзу ўваходзяць у дом бяз стуку
і скавышы пад кашуляй сплятаюцца амулетам
бо ёсьць рэчы хутчэйшыя за хуткасьць сьвятла і гуку
і ты засынаеш у заўтрашнім водары лета

## ICH LIEBE

Ich liebe водар, які вісіць на іх ліпе,
птаха, каторы зь ліпы вучыць мой плэер сьпевам.
Зьмешваю рызыкоўна, бы ў навароченым кліпе,
музыку ў правым вуху й гукі гораду ў левым.

Горад шалее ветрам і таксамі на прагулянцы.
Пачувайся як дома, ды памятай, што ў гасьцях.
Гарбату з пакунка да вуснаў падношу ў шклянцы,
і цэтлік лунае на нітцы, нібы нямецкі сьцяг.

Да найбліжэйшай крамкі радасна па бухло іду.
Дзеткі сьмяюцца дакорліва ўсьмешкай маёй дачкі.
Няма журналістаў, якім хацелася б даць па таблоіду.
Ёсьць камікадзэ на колах —матацыклісты й тарчкі.

Крочу на могілкі ў пошуках лепшага таварыства.
Толькі цяпер разумею, дзе ён, Эдэмскі сад.
Вавёрка танчыць наўкола, быццам душа турыста,
што выпадкова зайшоў сюды — і ня выйшаў назад.

Бы ўпершыню ў рэале, кажаш: «Якое трасцы!
Зараз пойдзем у нэт і, як той казаў, адажжом!..»
Вецер пагойдвае кветкі на Raabestraße.
Гарбату, што выйшла замоцнай, Бэрлін разбаўляе дажджом.

## ПАДВОДНЫЯ СНЫ

Твой горад кідае сёньня то ў зьліву, то ў сьпёку.
Кашулі ад поту й дажджу на целах вісяць, як анучы.
А ты прытулілася да мяне з самага мокрага боку
і пільна глядзіш у вочы, таемныя думкі скануючы.

І ўсё, што наўме, — на твары, і ўсё, што на твары, — наўме.
І думкі відаць наскрозь, бы рыбкі ў акварыюме, —
падводныя адысэі, што, пераблытаўшы жанры,
шукаюць корму і дыхаюць зьлівай праз жабры.

А ты скануеш так пільна, што разумею — труба.
І зьліва зь Менску кропля па кроплі выціскае раба.
Падводныя адысэі зь цябе ня зводзяць вачэй,
і там, дзе стукае сэрца, кашуля сохне хутчэй.

## НЕСЫМЭТРЫЧНЫЯ СНЫ

каб меў я мабільнік, зараз было б на ім безь сямі тры
ноч — і мы сьнім адно аднаго, але без сымэтрыі

ты сьніш, быццам я на верш для цябе не шкадую паперы
я сьню, быццам ты мне звоніш, і я званю — табе ў дзьверы

ты сьніш, бы вязеш з бацькамі знаёміць, а я — што іх дома няма
і ты са мной застаесься зусім нечакана сама

ты сьніш, нібы я сарамлівы, а я — што нахабны і дужы
ты —быццам кахаю ў душЫ, а я — што кахаю ў дУшы

ты сьніш, нібы кажаш: каго яшчэ ў свае запішу я абраньніцы
а я — што лаві імгненьне і хопіць згадваць аб раніцы

ты сьніш, бы звоніць мабільнік і мы спыняемся ў выніку
а я — што за кайф, калі табе не ламаюць кайф па мабільніку

я сьню, нібы вучыш мяне такім рэчам, якім не вучылі ў школе
ты сьніш, нібы я нарэшце кажу, чаго не казаў ніколі

я сьню, што мы разам з табой парушаем да раніцы цішыню
у сьне, дзе ты проста ню, а я цябе проста сьню

***

у нэце заторы сыгналам цесна і вузка
і словы зьбіваюцца ў купу ствараючы дзіўныя сумесі
пройдзе ці не вярблюд праз ігольнае вушка
сёньня залежыць толькі ад якасьці сувязі

шыя стамляецца да сярэдзіны лета
круціць галавою за кожнай — абернецца не абернецца
дзяўчаты спрачаюцца ці дрэнная гэта прыкмета
калі табе позна ўначы перабегла дарогу суперніца

гавораць што мроіць ня шкодна хоць часам ня варта
ці двойчы згатуеш той самы кубак гарбаты
ды мроі шыхтуюцца бы ганаровая варта цябе і
магіла ня выпрастае гарбаты

нібыта касьмічны монстар ляціш не ў сваёй талерцы
і срэбныя зоры ўваччу як сьвяточны салют
і пульс скача так нібы ў гэтую хвілю праз сэрца
праходзіць вярблюд

## ЗЯЛЁНАЯ ГАРБАТА

Гэткае адчуваньне, што да мяжы засталося гадзіны дзьве,
як тады, калі на ялінках у Беластоку расквіталі гірлянды;
ты чуеш, як малазнаёмая мова гудзе ў галаве,
як булькае ў торбе чароўны напой з Ірляндыі.

А недзе ЖЖ-карыстальніца зь немаўлём піша сваю ідылію,
і цішыня, падзяляючы вашыя словы, здаецца няспынннай;
покуль ты, нібыта вясьляр акадэмічнага стылю,
набіраеш хуткасьць наперад сьпінай

у *intercity* ў адным вагоне з аматарамі паленьня,
і на ролю ахвяры табе пасаваў бы любы, —
але недзе там немаўля, седзячы ў яе на каленях, сьмяецца табе
здалёк на ўсе чатыры зубы.

І ты дасылаеш ёй словы, якія ня будуць страляць гарматай,
але павольна дзейнічаць далікатна запаранай зялёнай гарбатай,
каб яна ад іх не заплакала, на сьмех усяму тралейбусу,
сярод падагрэтага зусім не зялёнай гарбатай плебсу.

Каб вершы чыталіся лёгка ў лістах і далучаным «вордзе»,
не палілі агнём і не студзілі як лёд,
каб, робячы перасадку ў незнаёмым аэрапорце,
яна, зачытаўшыся, не спазьнілася на самалёт.

# IX.

# «ТАМ, ДЗЕ НАС НЯМА...»

***

там, дзе нас няма, цяпер зіма
мроі з воску лепяцца па-свойску
канапляны водар задарма
і байцоўскі клюб заместа войска

там бывае добрай навіна
робяцца прыемныя адкрыцьці
хочаш волі — апынайся на
а ня хочаш — хоць на маргарыце

там да самай сьмерці маладосьць
на раство — халвы халяўнай торба
там, дзе мы пакуль яшчэ ня ёсьць
і таму — па азначэньні —добра

бізнэс-чортам лётае каваль
бо жадае туфлікі аксана
там, дзе нас пакуль яшчэ, на жаль
зрэшты, дзе мы ёсьць — зіма таксама

***

Малая, я выйшаў з дому пасьля вечаровых навінаў,
якраз пачынаўся трэці пэрыяд хакейнага матчу:
канадцы па поўнай праграме пярдолілі фінаў,
ці, можа, фіны канадцаў — тыя таксама мача.

А два з паловай гады таму ты плыла ў велікодных званах,
мазала шчасьце на хлеб і мне прапаноўвала лусту…
Пасьля пайшла ад мяне да першага лепшага нах-
імаўца і, як відаць па мэйлах, цалкам зьехала з глузду.

Хтосьці казаў, што ты ў інтэрнэт ходзіш, як на хаўтуры,
пасьля сябе пакідаючы мёртвыя жывыя дзёньнікі…
І пальцы бяруць дзьве актавы кірыліцы-клявіятуры,
і дрэнныя рыфмы б'юцца аб шкло манітора, як матылькі-
аднадзёнкі.

Яшчэ сем дзён, нібы сем самураяў, у баявой апранасе
ідуць паўзь мяне ў беспрабуднай цішы, на восьмы ж
я разумею: дзеля таго каб забыць адну вар'ятку, прынамсі
патрэбна другая вар'ятка, а дзе такіх яшчэ возьмеш?

І што там на юзэрпіку за голыя ногі? Ня сьцяміце.
І што там за прыгажуня сьмяецца ў начным трамваі
табе напаўабарота? Бо час сутыкаецца з памяцьцю,
час сутыкаецца з памяцьцю — і забівае.

## АСЕНЬНЯЕ ЛІСЬЦЕ

*Памяці Оскара Пітэрсана*

быў час калі на ялінкі
мяняюць звыклыя елкі
я выменяў тры пласьцінкі на
вашыя дзьве кружэлкі а потым
на «караване» сьлёзы змываў у
ваньне

і жоўтае лісьце сумленна
ляцела з пустога сквэру
у рытме поля вэрлена
зь вітаньнем жаку прэвэру
і восень жазэфа касма
гучала быццам зіма

і восень зіму прысьніла
і зноў калядныя ёлкі
і нат па сьмерці вінілу
жыцьцё на канцы іголкі
і круціць і круціцца час
пакуль ня скончыўся джаз

хай шчокі надзьме гілесьпі
і неба хопіць у лёгкіх
і вашая тэма ўзьлезе
па гуках яго далёкіх

а мы прыслухоўвацца станем
шчасьлівых калядаў астатнім

*24-25 сьнежня 2007*

***

у той губэрні ўсё менш табе незнаёмых паветаў
«доўга й шчасьліва» бяз рэшты ня дзеліцца на дваіх
і ўсё што ты можаш гэта перакладаць мёртвых паэтаў
на радаўніцу і дзяды а на вялікдзень жывых

калі вырастае трава то вядома зьяўляюцца і касцы
касіць пад беднага ёрыка здолее кожны спэц
і ўсё што ты можаш раз ці двойчы на год даглядаць капцы але
— выпівай на ім альбо не — капец ён і ёсьць капец

і ўсё што ты можаш гэта ўдаваць бы вочы сьлязяцца на сонцы
бо ў той губэрні незнаёмых паветаў застаецца ўсё меней
хаваеш рукі ў кішэні нібы ў дзіцячай пясочніцы
і камбінацыі пальцаў хапае ўсяго на тры жмені

і ўсё што ты можаш набыць у краме цацачнае аўто
а потым сярод тканінаў новы льняны ручнік
прынесьці ў хату прэзэнты малому кіроўцу што
паставіць аўто на ручнік і на хвілю ты перамог жартаўнік

і хтосьці даедзе да польскай мяжы а хтось апынецца ў бэрліне
а хтосьці ў дарожным трэйлеры дамчыць да сваёй аёвы
а хтосьці дабраўся хутчэй за ўсіх і ўжо за апошняй лініяй
і ўсё што ты можаш — румзаць і крэмзаць вось гэты вершык…

## СУСЕДЗІ

Калі ты раптоўна зрываесься з ложку ў чвэрць
на трэцюю ночы, бо ў дзьверы нехта пазвоніць,
ня бойся: гэта ня злодзей, ня мент і тым больш — ня сьмерць,
а проста сусед памыліўся званком, шукаючы тых, хто гоніць.

Таму што за сьценкай ад вас жыве ідэальная пара,
далёка ад журналістаў і аўтараў вікіпэдыі,
трыццаць гадоў душа ў душу, гандлюе сваім таварам:
яна разьлівае ў бутэлькі, а ён развозіць іх на мапэдзе.

Мы ведаем іх даўно: просяць на «ты» і па імені,
кажуць, з траіх дзяцей дома ніхто ня ўседзеў.
Бо дома са скрыняў бульбу тыраць разам са скрынямі.
А скажаш — так будуць гнаць, што лепш — самагонка суседзяў.

Часам зойдзеш да іх, пазычыш на сьвяты зэдлікі —
водар такі, што сьлёзы вышыбае з вачэй.
А ён насустрач ніколі ня выйдзе без камізэлькі.
А яна папярэджвае: «Ён глухі, ты грамчэй».

Яны так хадзілі пад ручку, што мы ледзь ня скручвалі шыяў…
Потым мы зьехалі. Кажуць, і ў іх ніхто цяпер не жыве.
Хочацца верыць, яны да сына перабраліся ў Кіеў.
Ці да старэйшай унучкі: здаецца, яна ў Літве.

Так і ўяўляю, як іх у пляцкартным вагоне трасе.
Цяжка дастаць матрасы, не паламаўшы карку.

Юная спадарожніца коўдры ім прынясе
і дапаможа запоўніць міграцыйную картку.

Лямпы пагасьлі. Паліцы засьцелены. Шклянкі зьвіняць ад руху.
Шчыльны туман за вокнамі падае на зямлю.
«Што ты кажаш, ня чую? Ды не крычы мне ў вуха,
я яшчэ не аглух!.. Так, я таксама люблю».

## ЗА ЗДАРОЎЕ!

Дарослыя п’юць
за здароўе з кілішку,
а потым хістаюцца,
як арэлі.
А мы з Аленкай
каторую лыжку ямо
за ўсіх нашых, каб
не хварэлі.

Сёньня за стол
сядаем бяз крыку:
не хуліганнь,
ты ж ужо дарослая!
Гэтая лыжка
за цёцю
Марыйку, хай
выздараўлівае
твая хросная!

Хатнія ў зборы,
нібы на сьвяты.
Смачна рубаць
макарону зь яешняй.
За дзядзю Ўладзю —
помніш, да таты
прыходзіў такі
барадаты, сьмешны?

Каб не хварэць
ніколі Алене!
Каб не хварэў
ніколі зусім
Бэмбі,
і мама з татам-аленем,
і кот Леапольд,
і каток Максім!

Булкі даволі
і соку даволі.
Татка таксама
злопаў пяльмені.
Апошняя лыжка —
за доктара Волю,
і хай ёй працы
здараецца меней!